Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 МАЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №93 (28457)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Па праспекце на ровары. Чаму б і не?**

СТАР. 4



**Варажбітка сказала… І трэба верыць?**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# НАДЗЕЙНЫ ПАРТНЁР І ВЯЛІКІ СЯБАР



Фота БЕЛТА.

З Сербіяй у Беларусі склаліся асаблівa прыязныя, па-сапраўднаму адкрытыя адносіны

**Яны грунтуюцца як на агульным — савецкім — гістарычным мінулым, так і на адносна нядаўніх падзеях. Беларусь падтрымала Югаславію (Сербія — яе пераемніца) у цяжкія 90-я, калі НАТА здзейсніла шэраг бамбардзіровак па тэрыторыі краіны: як па ваенных аб'ектах, так і па грамадзянскіх будынках. Сербія захавала добрыя кантакты з Беларуссю ў гады, калі Еўрасаюз увёў супраць нас санкцыі.**

## УЗАЕМНАЯ ПАДТРЫМКА

Беларускі лідар чатыры разы наведваў Сербію: у 1998, 1999, 2009 і 2014 гадах. Кіраўнікі сербскай дзяржавы здзяйснялі візіты ў Мінск у 1996, 2013 і 2015 гадах. Учора ж завяршыўся чацвёрты візіт кіраўніцтва Сербіі ў Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка ўжо шмат гадоў знаёмы з Таміславам Нікалічам, Прэзідэнтам Сербіі, — яны ведалі адзін аднаго яшчэ да таго, як апошні заняў вышэйшую дзяржаўную пасаду. Учора перад пачаткам размовы беларускі лідар узнагародзіў калегу ордэнам Дружбы народаў за значны ўнёсак ва ўмацаванне міру, сяброўскіх адносін і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Сербіяй.

СТАР. 2

# Рыбалка на Агінскім канале



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Выганашчы Івацэвіцкага раёна маюць магчымасць рыбачыць проста каля хат: паўз вёску працякае канал, які злучае Ясельду і Шчару — басейны Чорнага і Балтыйскага мора. Канал названы ў гонар Міхала Казіміра Агінскага, які быў ініцыятарам яго пабудовы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Эла СЯЛІЦКАЯ, намеснік міністра па падатках і зборах:**

*«У большасці краін аснову даходаў бюджэту складаюць падатковыя даходы. Іх доля і ў кансалідаваным бюджэце Беларусі перавышае 80%. Дарэчы, у 2012 годзе падатковыя даходы ў бюджэце складалі 87,6%, а ў 2015—2016-м — 83,6%. У структуры даходаў бюджэту асноўная доля прыпадае на падатак на дабаўленую вартасць — каля 30%. Другой па велічыні паступленняў даходнай крыніцай выступае падаходны падатак. На працягу пяці гадоў яго доля знаходзіцца на ўзроўні 14%. Доля падатковых даходаў ад знешнеэканамічнай дзейнасці (мытныя пошліны, зборы) складае каля 12%».*

■ Акцэнт на здароўе

# Людзі без хвароб

Самую розную інфармацыю ад урачоў прапануе новы інфармацыйны партал

**Факт: 9 з 10 беларусаў маюць адну або некалькі шкодных звычак. У параўнанні з шэрагам высокаразвітых краін у нас па-ранейшаму высокі працэнт тых, хто курыць, злоўжывае алкаголем, цукрам, соллю, — словам, мае вострую патрэбу ў праўдзівай, кампетэнтнай інфармацыі адносна харчавання і не толькі. Пра здаровыя стасункі, правільнае выхаванне дзяцей, сексуальнае і рэпрадуктыўнае здароўе і г. д. важна ведаць усім нам незалежна ад узросту, адукацыі, прафесіі і дастатку. Аб адкрыцці нацыянальнага інтэрнэт-партала «Здаровыя людзі» (www.24health.by) расказаў міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА.**




Інфармацыйны рэсурс, створаны на базе газеты «Медыцынскі веснік», аб'ядноўвае галоўныя сферы жыцця і мае паўнацэнную версію на беларускай мове, а таксама тэхналагічныя магчымасці павелічэння шрыфту для людзей са слабым зрокам. У партала ёсць старонкі ў сацыяльных сетках, мабільная версія.

— Пацыент сам нясе адказнасць за сваё здароўе, і наша задача — яго праінфармаваць, каб прадухіліць развіццё захворванняў, — кажа Валерый Малашка. — У нас ёсць пэўныя поспехі: сёння зніжаецца смяротнасць, расце нараджальнасць, па выніках гэтага года чаканая працягласць жыцця павінна перавысіць 74 гады, на што ўказвае тэндэнцыя першага квартала.

СТАР. 4

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8680 | ▲ |
| Еўра | 2,0788 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0707 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# НАДЗЕЙНЫ ПАРТНЁР І ВЯЛІКІ СЯБАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Я вельмі цаню тваю пазіцыю па Беларусі ўвогуле, — адзначыў беларускі Прэзідэнт, звяртаючыся да высокага госця.

— Сутнасць гэтай пазіцыі ў тым, што Таміслаў Нікаліч яшчэ да свайго абрання Прэзідэнтам прыязджаў у Беларусь і не проста прыязджаў, а адкрыта, сумленна і прынцыпова падтрымліваючы Беларусь, займаў жорсткую пазіцыю па абароне інтарэсаў беларускага народа, — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта галоўнае, таму што прэзідэнтамі мы абавязаны супрацоўнічаць: падабаемся мы адзін аднаму, не падабаемся, падабаецца дзяржаўнае ўладкаванне той ці іншай краіны або не падабаецца... Мы павінны ўспрымаць рэальна. А вось проста як чалавек — да абрання — Таміслаў Нікаліч быў асаблівым у адносінах да нашай краіны.

Сербія выдзяляе сярод прыярытэтаў у знешняй палітыцы ў першую чаргу уступленне ў Еўрасаюз. Тым не менш дзяржава заўсёды імкнулася падтрымліваць шчырыя адносіны з Беларуссю. Так, у мінулым годзе дзяржава ў ліку васьмі краін, што не ўваходзяць у ЕС, далучылася да рашэння Савета ЕС аб зняцці санкцый у адносінах да шэрагу беларускіх кампаній і грамадзян.

## ФУНДАМЕНТ БУДЗЕ ЎМАЦОЎВАЦЦА

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, узнагарода, якую ён уручыў Таміславу Нікалічу, — цалкам заслужаная:

— Тут няма ніякіх умоўнасцяў, тут няма нічога, што звязана з пасадай Прэзідэнта... Хоць і не без гэтага. Бо калі цябе абралі Прэзідэнтам Сербіі, мы здзейснілі тое, што павінны былі даўно здзейсніць, пры мінулых кіраўніках Сербіі. Бо як бы ні складвалася абстаноўка, сітуацыя ў Сербіі і Беларусі, мы, нашы народы заўсёды цягнуліся адзін да аднаго. Прэзідэнты не заўсёды адлюстроўвалі гэтыя думы і спадзяванні. І з абраннем Прэзідэнтам Сербіі цябе ў нас адчувальна змяніліся адносіны.

У апошнія гады актывізавалася супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Сербіі. 15 нашых гарадоў, у тым ліку ўсе абласныя цэнтры, усталявалі пабрацімскія і партнёрскія сувязі з гарадамі Сербіі. У мінулым чэрвені ў Мінску ўпершыню былі праведзены Дні Бялграда. Вядзецца работа па арганізацыі і правядзенні Дзён Мінска ў Бялградзе — плануецца, што яны пройдуць з 5 па 7 чэрвеня.

Трэба сказаць, што гэты месяц — апошні для Таміслава Нікаліча на пасадзе кіраўніка Сербіі. 31 мая заступіць на пасаду Прэзідэнта Аляксандр Вучыч, які перамог на прэзідэнцкіх выбарах другога красавіка. Зараз Аляксандр Вучыч з'яўляецца Старшынёй урада.

— Мы сустракаліся ў Пекіне з абраным Прэзідэнтам Сербіі Вучычам, — расказаў кіраўнік Беларусі. — Я заўважыў, што той фундамент, які мы заклалі ў аснову аднаўлення нашых сяброўскіх адносін — паміж нашымі народамі, праваслаўнымі народамі Сербіі і Беларусі, — гэты фундамент умацоўваецца. Я бачу гэта па абраным Прэзідэнце. Ён цалкам настроены гэтак жа, як і ты, праводзячы палітыку нашага сяброўства.

## АБ'ЁМЫ РАСТУЦЬ

Тавараабарот паміж дзяржавамі пакуль невялікі — адносна. У той жа час аптымізм усяляе станоўчая тэндэнцыя: дзякуючы пагадненню аб зоне свабоднага гандлю за сем гадоў Беларусь і Сербія нарасцілі тавараабарот амаль у пяць разоў — да 250 мільёнаў долараў.

На працягу студзеня—сакавіка бягучага года таксама назіраўся рост тавараабароту — мы натагравалі больш чым на чвэрць у параўнанні з адпаведным перыядам 2016-га. Пры гэтым павялічваецца і аб'ём беларускага экспарту ў Сербію. Увогуле, у супрацоўніцтве з гэтай краінай сальда для нас складваецца станоўчым.

— Тавараабарот у нас не вельмі штось, але яго ўвогуле не было! — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — І ён у разы павялічыўся за апошнія гады. У нас няма закрытых тэм. Вы павінны ведаць, што мы заўсёды з любоўю і павагай ставіліся да сербаў і будзем прытрымлівацца такой палітыкі. А цябе, Таміслаў, я прашу далёка не адыходзіць ад нашых адносін, трымаць іх навідавоку і прыязджаць у Беларусь часцей, падказваць па-сяброўску, што не так, на што трэба было б звярнуць увагу. Думаю, што Таміслаў стане добрым паслом добрай волі сербскага і беларускага народаў у імя ўмацавання нашага сяброўства. Я на гэта вельмі разлічваю.

Таміслаў Нікаліч падзякаваў за ўзнагароду і высока ацаніў стаўленне Прэзідэнта Беларусі да Сербіі. Па яго словах, тое, што Аляксандр Лукашэнка наведаў Сербію падчас бамбардзіровак НАТА, ніколі не будзе забыта. Таміслаў Нікаліч таксама пацвердзіў, што будучы сербскі Прэзідэнт, з якім яны знаёмы 25 гадоў, працягне працаваць над развіццём беларуска-сербскіх адносін. Таксама кіраўнік Сербіі падкрэсліў, што яны разам з Аляксандрам Лукашэнкам паднялі двухбаковыя адносіны на вельмі высокі ўзровень.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# Праца дапамагае выправіцца

**Практыку работы складаных падлеткаў у студатрадах трэба падтрымліваць і развіваць. Пра гэта заявіў Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі, падчас пасяджэння Камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў Беларусі.**

Падчас пасяджэння разглядаліся пытанні аб прафілактычнай рабоце з навучэнцамі прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама вопыт работы ў студэнцкіх атрадах з падлеткамі, якія стаяць на ўліку ў Камісіі. «Колькасць правапарушэнняў, здзейсненых непаўналетнімі, па выніках чатырох месяцаў у бягучым годзе знізілася на 15% у параўнанні з мінулым годам — з 711 да 599. Амаль палова з гэтых злачынстваў здзейснена навучэнцамі ліцэяў і каледжаў. У асноўным імі ўчыняюцца крадзяжы — 40%, хуліганствы — 19% і незаконны абарот наркотыкаў — 8,6%», — паведаміў віцэ-прэм'ер. Для выпраўлення сітуацыі, лічыць Васіль Жарко, трэба задзейнічаць усе рэзервы — сям'ю, педагогаў, разумна выбудаваць індывідуальную работу з навучэнцамі, неабходна ацаніць эфектыўнасць работы сацыяльна-педагагічных, псіхалагічных службаў устаноў адукацыі.

Аднак і ў гэтай сферы існуюць пэўныя хібы. Часам пад выглядам студэнцкіх атрадаў афармляюцца індывідуальнае працаўладкаванне навучэнцаў, часовая працоўная занятасць, арганізаваная за кошт фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. «Па звестках Генеральнай пракуратуры, толькі ў мінулым годзе ў горадзе Мінску было выяўлена 40 фармальных студэнцкіх атрадаў колькасцю каля 1000 чалавек. Міністэрству адукацыі неабходна забяспечыць больш жорсткі і дзейсны кантроль такіх пытанняў», — падсумаваў Васіль Жарко.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# Карысныя сувязі

## Пасяджэнне Парламенцкага камітэта ЦЕІ адбудзецца 30 мая ў сталіцы

**Аб гэтым учора заявіў Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з пасламі дзяржаў — членаў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы. На рабочай нарадзе абмяркоўвалі пытанні па падрыхтоўцы і правядзенні пасяджэння Парламенцкага камітэта.**

Цэнтральнай тэмай пасяджэння стане «Інтэлектуалізацыя эканомікі ў рэгіёне ЦЕІ: інавацыйная вытворчасць, кіраванне і чалавечы капітал». На сённяшні дзень у сустрэчы пагадзіліся прыняць удзел 11 краін. «Па наяўных у мяне сёння звестках, пацвярджэнне ёсць ад Аўстрыі, Італіі, Сербіі, Славеніі, Румыніі, Польшчы, Малдовы, Харватыі, Балгарыі, Славакіі і Венгрыі», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч.

— Мы, вядома, вельмі зацікаўлены ў тым, каб як мага актыўней уключацца ў эканамічныя і сацыяльныя сувязі ў Еўропе, — сказаў спікер верхняй палаты. — У першую чаргу гэта Цэнтральная і Усходняя Еўропа, паколькі ЦЕІ прадстаўляе менавіта гэтае кола дзяржаў.

Кіраўнік Савета Рэспублікі таксама дадаў, што ўсяго ў праграме плануецца больш за 20 мерапрыемстваў, пры гэтым частка з іх пройдзе не ў Беларусі, а ў Вене, Венецыі, Зальцбургу і іншых еўрапейскіх гарадах. 8 чэрвеня ў Мінску пройдзе міністэрская канферэнцыя па тэматыцы ўзаемасувязяў і сумяшчальнасці ў рэгіёне ЦЕІ «Наводзячы масты паміж Еўропай і Азіяй», а 22 чэрвеня ў сталіцы адбудзецца сустрэча міністраў замежных спраў краін Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы. Акрамя таго, у лістападзе ў Мінску плануецца пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ.

Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва — гэта арганізацыя, створаная ў 1989 годзе для садзейнічання развіццю ўстойлівых сувязяў паміж дзяржавамі Цэнтральнай, Заходняй і Усходняй Еўропы ў галіне палітыкі, эканомікі і культуры, а таксама для недапушчэння з'яўлення новых раздзяляльных ліній у еўрапейскім рэгіёне. Сёння ў ЦЕІ налічваецца 18 краін-удзельніц. Беларусь стала членам арганізацыі ў чэрвені 1996 года, а ў 2017-м упершыню прыняла на сябе місію старшынства ў форуме.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Акрэдытацыя на сесію ПА АБСЕ пачалася

**У ліпені ў Мінску пройдзе 26-я сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Як паведаміў падчас брыфінгу начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК, традыцыйна пасяджэнні сесіі ПА АБСЕ шырока асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі.**

— Спадзяёмся, што і гэты год не стане выключэннем, — сказаў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства. — МЗС Беларусі разам з Міжнародным сакратарыятам Парламенцкай асамблеі АБСЕ будзе рабіць усё магчымае, каб забяспечыць камфортныя ўмовы працы для прадстаўнікоў замежных і айчынных СМІ падчас сесіі.

### Адкрыццё пераносяць

Адкрыццё аддзялення пасольства Нідэрландаў у Беларусі, якое планавалася правесці ў наступны панядзелак, адкладваецца па просьбе нідэрландскага боку. Такую інфармацыю агучыў Дзмітрый Мірончык, адказваючы на пытанне, хто з прадстаўнікоў кіраўніцтва нашага МЗС будзе ўдзельнічаць у згаданым мерапрыемстве і ці атрымаюць на яго запрашэнне СМІ.

— На жаль, гэта цырымонія перанесена па просьбе нідэрландскага боку па цалкам аб'ектыўных абставінах, звязаных са станам здароўя высокага госця, прыезд якога ў Беларусь для адкрыцця аддзялення пасольства планаваўся. Але мы чакаем, і, безумоўна, запросім на мерапрыемства прэсу.

Дзмітрый Міронычк таксама згадаў той аптымістычны факт, што дыпламатычная прысутнасць у Беларусі пастаянна пашыраецца за кошт значных і цікавых для нас з гандлёва-эканамічнага і палітычнага пункту гледжання краін. Так, у мінулым годзе ў Беларусі было адкрыта пасольства Аўстрыі. Гэта падзея тым больш значная, што адбылася на фоне закрыцця Аўстрыйскай Рэспублікай пасольстваў у шэрагу блізкіх да нас дзяржаў.

### Для беларусаў — без наступстваў

Адказваючы на пытанне аб магчымым уплыве на беларусаў, якія хочуць перасячы ўкраінскую мяжу, нядаўняга падпісання дакумента аб бязвізавым рэжыме паміж Украінай і ЕС, Дзмітрый Міронычк запэўніў, што для нашай краіны гэта падзея не нясе ніякіх наступстваў.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Каля 500 найбагацейшых людзей у свеце страцілі за дзень $35 млрд

Гэта адбылося з-за скандалаў, звязаных з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам, вынікае з даных індэкса Bloomberg Billionaires Index. Амерыканскія фондавыя індэксы ўпалі пасля навін аб звальненні прэзідэнтам ЗША дырэктара ФБР Джэйма Комі і расследаванні пра сувязі Трампа з Расіяй. Як стала вядома, самы багаты чалавек, па версіі агенцтва, Біл Гейтс страціў $1 млрд за адзін дзень. У сваю чаргу, заснавальнік Amazon Джэф Безас, чый капітал ацэньваецца ў $83,6 млрд, страціў $1,7 млрд. Больш за ўсё страт ад палітычных скандалаў з Трампам панёс заснавальнік сацыяльнай сеткі «Фэйсбук» Марк Цукерберг: за адзін дзень ён страціў $2 млрд з-за падзенняў акцый яго кампаніі.

## Масул могуць пакінуць да 200 тысяч чалавек з-за баёў у горадзе

Міжнародная арганізацыя па міграцыі паведаміла, што каля 370 тысяч чалавек у Іраку вымушана пакінулі свае дамы за сем месяцаў з пачатку аперацыі па вызваленні Масула ад баевікоў ІД. «Па меры таго як інтэнсіўнасць ваенных аперацый нарастае і яны набліжаюцца да старой часткі Масула, мы чакаем, што яшчэ да 200 тысяч чалавек пакінуць раён», — прыводзіць словы агенцтва «Рэйтэр» словы каардынатара гуманітарных праграм ААН па Іраку Ліз Грандэ. Цяпер іракскія ваенныя і кааліцыя на чале з ЗША праводзяць аперацыю па вызваленні Масула.

## Кітай абвясціў аб пачатку новай вуглевадароднай рэвалюцыі



Кітайскія нафтавікі першымі ў свеце здабылі са дна Паўднёва-Кітайскага мора «гаручы лёд» — гідрат прыроднага газу. «Гэта будзе такой жа буйной падзеяй, як сланцавая рэвалюцыя, што адбылася раней у ЗША», — заявіў намеснік упраўлення геалагічных даследаванняў Міністэрства зямельных і прыродных рэсурсаў КНР Лі Цзіньфа. Адзін кубічны метр гідрату эквівалентны 160 кубічным метрам прыроднага газу ў газападобным стане (на 100 літрах газу аўтамабіль можа праехаць 300 кіламетраў, тады як на 100 літрах «гаручага лёду» — 50 тысяч кіламетраў). Работы па здабычы прыроднага рэсурсу вядуцца і іншымі краінамі, у прыватнасці Канадай і Японіяй, аднак пакуль толькі Кітаю ўдалося дастаць гідрат з дна мора.

## РПЦ заклікала Дзяржджуму заканадаўча прызнаць аборты забойствам

Намеснік Новаіерусалімскага манастыра архімандрыт Феафілакт заклікаў дэпутатаў Дзяржджумы на заканадаўчым узроўні прызнаць аборты забойствам і забараніць іх, паведамляе РБК. «Аборт павінен быць прызнаны забойствам. На гэты закон усё ж такі трэба звярнуць увагу, і ён павінен быць прыняты», — сказаў архімандрыт на пасяджэнні міжфракцыйнай рабочай групы Дзяржджумы па абароне хрысціянскіх каштоўнасцяў. Між тым у снежні мінулага года экспертная група пры ўрадзе РФ адхіліла ініцыятыву аб выключэнні абортаў з сістэмы абавязковага медыцынскага страхавання. Тады ва ўрадзе заявілі, што ні грамадства, ні дзяржава не мае права прымаць «людаедскія рашэнні».

■ Не прапусці!

# Тыдзень бэзу

## стартуе 19 мая ў Цэнтральным батанічным садзе Акадэміі навук

**І хоць зацяжная і халодная вясна адсунула сёлета свята на некалькі тыдняў, ёсць усе прыкметы таго, што да выхадных дзён бэзавыя кусты расквітнеюць.**

Дарэчы, знакамітая калекцыя бэзу батанічнага саду налічвае больш як 250 сартоў, у тым ліку вельмі рэдкія сарты айчыннай і сусветнай селекцыі. Шэраг сартоў увогуле маюцца толькі ў Цэнтральным батанічным садзе. У 2015 годзе ў рэестр раяніраваных сартоў быў уключаны новы сорт бэзу «Мінская прыгажуня». Калекцыя заслужана аднесена да нацыянальных здабыткаў і ўключана ў афіцыйны кадастр ахоўных калекцый Беларусі.

Увесь тыдзень, штодня з 13 да 15 гадзін наведвальнікаў чакаюць цікавыя сустрэчы з куратарам калекцыі бэзу, кандыдатам біялагічных навук Натальяй Македонскай, экскурсіі па бэзавым садзе і кансультацыя па доглядзе за гэтай цудоўнай раслінай.



Новы беларускі сорт бэзу «Мінская прыгажуня».

Але самае цікавае і насычаная падзея тыдня адбудзецца 20 мая ў выглядзе культурна-асветніцкай акцыі «Бэз — крыніца натхнення». У рамках мерапрыемства будзе прадстаўлены ўнікальны парфумерны бар — 180 водараў розных кампазіцый, сярод іх — больш як 15 адценняў бэзавага. Таксама адбудзецца прэзентацыя водару «Паветра», які з'яўляецца арома-сімвалам Беларусі. Формулу гэтай парфумы распрацавала гуру сусветнай парфумерыі, ураджэнка Беларусі Сафія Гросман у памяць аб радзіме.

Праграма свята ўключае дэфіле мадэляў з бэзавымі аксесуарамі ад прафесійных фларыстаў, незвычайны майстар-клас «Псіхалогія колеру — сем адценняў бэзу», мастацкі пленэр «Натхняльны бэз», флэшмоб «Бэзавае марожанае», продаж саджанцаў бэзу ў краме батанічнага саду і іншыя яркія моманты.

Незабыўную атмасферу свята дапаможа стварыць сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам дырыжора Уладзіміра Авадка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ЧАКАЕМ МАЙСКІХ НАВАЛЬНІЦ

**У выхадныя ў Беларусі — да 27 градусаў цяпла, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя. Гэта звязана з прыходам у краіну цёплых паветраных мас з паўднёвага захаду Еўропы.**



Так, ужо сёння днём тэмпература на пераважнай частцы тэрыторыі Беларусі дасягне 24 градусаў, а на захадзе слупок тэрмометра падымецца да 26 градусаў. Ападкаў не прагназуецца. У суботу захаваецца цёплае надвор'е пераважна без ападкаў, толькі на поўначы Віцебшчыны магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—12 градусаў, удзень 20—27. Нядзеля таксама будзе цёплай, але ўжо з ападкамі: ноччу ў некаторых рэгіёнах, а днём на большай частцы краіны пройдуць дажджы, месцамі — навальніцы. Уначы тэмпература будзе знаходзіцца на ўзроўні 9—14 градусаў, удзень 18—25, у некаторых раёнах паветра прагрэецца і да 27 градусаў.

Пачатак тыдня таксама стане дажджлівым. У панядзелак ноччу кароткачасовыя дажджы і навальніцы чакаюцца на поўдні краіны, днём пераважна без ападкаў. Сіноптыкі прадказваюць начную тэмпературу на ўзроўні 7—14 градусаў, а па ўсходзе ўсяго 4—6 вышэй за нуль. Днём тэрмометр пакажа ад 15 да 22 градусаў цяпла, на паўднёвым захадзе — да 25. У аўторак і сераду ў асобных раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы, тэмпература ўначы складзе 5—12 градусаў, удзень 19—25.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Здарэнні

# Страляў па варонах, патрапіў у акно

**За здзяйсненне хуліганскіх дзеянняў у сталіцы затрымалі раней не судзімага 35-гадовага гараджаніна, які стрэламі з пнеўматычнай вінтоўкі пашкодзіў шыбы ў вокнах у доме насупраць свайго.**

— У міліцыю звярнуліся дзве гараджанкі, якія расказалі, што ў іх пры невядомых абставінах былі пашкоджаны вокны. Высветлілася, што да гэтага датычны мужчына. Па словах затрыманага, яго сталі моцна раздражняць сваімі крыкамі вароны на вуліцы. Ён вырашыў прагнаць іх, для чаго ўзяў пнеўматычную вінтоўку і адкрыў стральбу па птушках. Аднак замест іх выпадкова патрапіў у вокны кватэр дома насупраць, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Мужчыну можа пагражаць пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Выпускны для тых, каму за 60

**18 мая адбыўся выпускны вечар слухачоў Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту. Сертыфікаты аб заканчэнні ўніверсітэта атрымалі звыш тысячы чалавек.**

**Праект «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту» рэалізуецца ГА «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў» пры падтрымцы кампаніі JTI.**

Сярод навучальных кірункаў — курсы камп'ютарнай адукаванасці, асновы работы на планшэтах і смартфонах, выкарыстанне графічнага рэдактара, журналістыка, псіхалогія, краязнаўства, восем замежных моў, аратарскае майстэрства, стрэтчынг і іншыя.

Усё навучанне было бясплатным. Гэта аказалася магчымым дзякуючы таму, што ў рабоце Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту прымалі актыўны ўдзел валанцёры. Сёлета іх колькасць складала 100 чалавек. Гэта студэнты, працуючыя спецыялісты і — самі людзі пенсійнага ўзросту.

Многія валанцёры працуюць у дадзеным праекце ўжо не адзін год. Падчас выпускнога вечара ўсе яны выйшлі на сцэну, каб яшчэ раз пачуць словы падзякі ад сваіх вучняў. Студыя Дакументальнага кіно ўніверсітэта трэцяга ўзросту падрыхтавала цэлы архіў відэа аб рабоце праекта. А выпускнікі факультэта замежных моў на выпускным вечары праспявалі на англійскай і польскай мовах!

Як адзначае **спецыяліст па камунікацыях Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў Вольга ШЫШЛО,** акрамя заняткаў у навучальных класах студэнты элегантнага ўзросту таксама актыўна валанцёрылі, прычым іх валанцёрская дзейнасць выходзіла далёка за межы працы ўласна ва ўніверсітэце. Яны арганізоўвалі дабрачынныя акцыі, чыталі лекцыі і праводзілі навучальныя майстар-класы, займаліся буккросінгам, наведвалі былых вязняў канцлагераў, дапамагалі маладым мамам глядзець дзяцей. А ў сакавіку і красавіку ва ўніверсітэце праходзіў «Валанцёрскі марафон».

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# Квэсты, сярэднявечныя танцы і новыя рарытэты

**Ужо сёння, 19 мая, Бабруйск — сёлетняя культурная сталіца — запросіць аматараў квэстаў ад 14 гадоў і старэйшых на гульню-квэст «Непрадбачаныя наступствы адной іскры» з удзелам легендарнага шпіка Аркадзя Кашко. Дарэчы, ураджэнца вёскі Брожа Бабруйскага павета.**

А вось магілёўскія музеі падрыхтавалі свае сюрпрызы на 20 мая. Музей гісторыі Магілёва, дзе захоўваецца адзіны ў краіне арыгінал Статута ВКЛ 1588 года, не перастае здзіўляць новымі здабыткамі, пра якія раскажа выключна ў суботу і не раней, што вартае, каб прыехаць у Магілёў. У гэтым жа музеі захоўваецца вельмі рэдкая рэч — літургічнае покрыва са слуцкімі паясамі (аналойнік), якое спецыяльна прадэманструюць гасцям падчас выстаўкі аднаго прадмета. Аматараў розных прыгод чакае захапляльны энекаўнтар, падчас якога можна будзе пабегаць не толькі па патаемных кутках ратушы, але і па гістарычным цэнтры Магілёва. «Што будзем шукаць, пакуль загадка», — усміхаецца дырэктар музея Аляксей Бацюкоў. Тут жа адкрыецца выстаўка лінагравюр Базыля Камарова з выявамі выдатных дзеячаў магілёўскай гісторыі, а таксама адбудзецца канцэрт дударскага цэха і ансамбля сярэднявечнага танца магілёўскай гімназіі — каледжа мастацтваў.

Не менш цікавую праграму прапануе найстарэйшы музей Магілёва — абласны краязнаўчы імя Е. Раманава, які сёлета адзначае 150 гадоў сваёй дзейнасці. Тут таксама будзе шмат інтэрактыву, майстар-класаў, экскурсій-прэзентацый. Наогул, сёлета Магілёў вельмі багаты на юбілейныя даты — 750 гадоў гораду, 400 — магілёўскаму кнігадрукаванню, 440 — са дня атрымання Магдэбургскага права, 300 — з дня нараджэння асветніка Магілёва і яго дабрадзея Георгія Каніскага. Пра ўсё гэта больш падрабязна можна будзе даведацца падчас міні-экскурсій з інтэрактыўнымі зонамі. Тут таксама запрасіць на квэст-гульню «Знайдзі артэфакт» і прапануюць паўдзельнічаць у віктарынах. А філіял краязнаўчага — музей этнаграфіі — апроч усяго, пакажа за вечар некалькі спектакляў.

У суботу ўсе музеі ў Магілёве працуюць з 18.00 (некаторыя з 17.00) і да поўначы. Цэны на білеты — сімвалічныя. А ў музеі гісторыі Магілёва будзе дзейнічаць адзіны білет на наведванне двух аўтаномных установ — ратушы на плошчы Славы і выставачнай залы на вуліцы Болдзіна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Весткі з Кітая

# ЗНАКІ СЯБРОЎСТВА

**Адбылася прэзентацыя кніжнай серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» Выдавецкага дома «Звязда».**

У Доме дружбы было прадстаўлена новае выданне — зборнік перакладаў класічнага кітайскага паэта Мэн Хаажаня. «Мудрасць гор маўклівых» — восьмая кніга серыі, якая ўжо прадстаўляла раней беларускія перастварэнні Ду Фу, Лі Бо, Ван Вэя, Ай Ціна, Лі Хэ, Лі Цінчжаа, Ван Гачжэня. Загучаць па-беларуску кітайскім паэтам розных эпох дапамагалі Мікола Мятліцкі, Леанід Дранько-Майсюк, Рагнед Малахоўскі, Таццяна Сівец, Алена Раманоўская і іншыя. Перакладчыкамі паэзіі Мэн Хаажаня выступілі Навум Гальпяровіч, Алесь Бадак, Юлія Алейчанка, Валерыя Саротнік, Дар'я Нечыпарук. Каштоўнасць серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» найперш у тым, што пераклад ажыццяўляецца або наўпрост з мовы арыгінала, або па падрабязна каментаваных падрадкоўніках пад кіраўніцтвам спецыяліста-кітаязнаўцаў. Таксама, пачынаючы са зборніка Ван Гачжэня, у выданнях змяшчаюцца і кітайскія тэксты побач з перакладамі, што з'яўляецца выдатнай знаходкай для даследчыкаў беларускай школы мастацкага перакладу і значна пашырае прадстаўленасць кніг серыі ў сучаснай кітайскай культурнай прасторы.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў прэзентацыі выступіў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ,** які падзяліўся планамі стварыць Цэнтр культуры Беларусі ў Пекіне, а таксама ідэямі, што будуць агучаны на пасяджэнні беларуска-кітайскага падкамітэта па культурных сувязях, якое пройдзе ў канцы мая ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы.

**Намеснік міністра інфармацыі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** падкрэсліў важнасць выданняў серыі «Светлыя знакі. Паэты Кітая» ва ўсталяванні актыўнага культурнага дыялогу паміж Кітаем і Беларуссю, выказаў спадзяванні на далейшае плённае развіццё кніжнага праекта і прэзентацыі яго на міжнароднай арэне.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Падтрымаў выдавецкую ініцыятыву і загадчык аддзела па справах культуры пасольства КНР у Рэспубліцы Беларусь Чжан Хунвэй.

**Дырэктар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ** агучыў перспектывы серыі, падзяліўся планамі выдання зборнікаў Сюй Чжымо і Вэнь Ідо.

Падчас мерапрыемства гледачы мелі магчымасць азнаёміцца і з выстаўкай графічных работ вядомага мастака Каміля Камала, які па-філасофску пераасэнсоўвае кітайскую рэчаіснасць у ілюстрацыях да перакладных кніг. Кітайскія песні і танцы прадставілі студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і вучні сталічнай гімназіі №23. Мелодыка кітайскай лірыкі гучала ў выкананні студэнткі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Яўгеніі Кудрык. Шчодра дзяліліся сваім перакладчыцкім вопытам Мікола Мятліцкі, Навум Гальпяровіч, Леанід Дранько-Майсюк.

**Юлія АЛЕЙЧАНКА**

■ У добры шлях!

# НОВЫ ПАВАРОТ

## У Мінску ўсё больш людзей на роварах

**Яшчэ дзесяцігоддзе таму ідэя перамяшчэння па сталіцы на веласіпедах многім здавалася смешнай і нават недарэчнай. Маўляў, гэта для сельскай мясцовасці, дзе альтэрнатывы няма, а ў горадзе, калі ласка, — грамадскі транспарт. Або ўніверсальны варыянт — машына: хутка і з камфортам. Тым не менш цяпер усё больш гараджан аддаюць перавагу менавіта веласіпеду. Мы высветлілі, у чым плюсы такога выбару і як будзе развівацца веларух у найбліжэйшай будучыні.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Вага, узрост і статус не перашкода

Тое, што веласіпедыстаў стала значна больш, заўважна і без падлікаў, але па-сапраўднаму ацаніць маштабы гэтай «з'явы» дапамог велакарнавал «VIVA ровар», які сабраў у сталіцы амаль 15 тысяч удзельнікаў.

Напярэдадні свята, а па-іншаму назваць такую буйную падзею не атрымліваецца, адбылася першая веласіпедная канферэнцыя гарадоў Беларусі. Арганізатарамі выступілі грамадская арганізацыі пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму, сваім вопытам падзяліліся замежныя эксперты і **старшыня праўлення Мінскага веласіпеднага таварыства Павел ГАРБУНОЎ.**

Актывіст адзначыў, што стаўленне да веларуху ў сталіцы пазітыўнае, але з лёгкім налётам здзіўлення: «Няўжо вам не холадна і не слізка зімой?» (а гэтая пара года ў нас мае ўласцівасць ой як зацягвацца).

Выразны адказ гатовы ў кожнага велааматара: «Не, пры правільным выбары адзення не холадна, так, слізка, але вельмі рэдка».

— Самае галоўнае, што цяпер адыходзіць меркаванне, быццам бы веласіпед — гэта непрэстыжна. Яго выбіраюць людзі рознага ўзросту, камплекцыі і сацыяльнага статусу. Напрыклад, паспяховы бізнесмен Аляксандр Цэнцер любіць перасоўвацца па горадзе менавіта так. Нарэшце прыйшло разуменне, што ровар прызначаны не толькі для забавы або спорту, але гэта і паўнавартасны від транспарту. Істотным бар'ерам пакуль застаецца зімовая язда. Умоўна, першага верасня ўвесь рух замірае, хоць для велапаездак восенню і больш спрыяльныя ўмовы — не так горача, — адзначыў Павел.

Згодна з апошняй статыстыкай каля 1% усіх сумарных паездак у горадзе прыпадае на веласіпед, але толькі ў 0,4% выпадкаў яго выкарыстоўваюць з утылітарнымі мэтамі, напрыклад каб дабрацца на работу або вучобу. У выніку ў Мінску ў летні час здзяйсняецца каля трох тысяч утылітарных паездак штодня. За апошнія шэсць гадоў гэтая лічба павялічылася, па розных звестках, у 7—10 разоў. Увечары паабапал праспекта Незалежнасці налічваецца каля 200 веласіпедыстаў. У цэнтры нярэдкія сітуацыі, калі на адным скрыжаванні збіраюцца 5—7 веласіпедыстаў. Да 400 чалавек карыстаецца так званым велабанам.

### Веласіпедны афіцэр

Натуральна, падобны ажыятаж цягне за сабой і пэўныя змены ў гарадской інфраструктуры, якая падладжваецца пад запыты розных катэгорый грамадзян. У Мінску яшчэ ў 2011 годзе была створана веласіпедная гарадская канцэпцыя, на базе якой распрацоўваюцца гадавыя планы работ.

Цяпер у сталіцы адаптаваны для веларуху 73 вуліцы: пастаўлены спецыяльныя знакі, вылучаны асобныя дарожкі на тратуарах, паніжаны бардзюры, на некаторых — зроблены велапераезды, усяго ў Мінску іх каля 800. У астатніх гарадах гэта пакуль вялікая рэдкасць: толькі ў Полацку іх 9 і 8 у Брэсце. У Мінску ж цяпер нават у генплане пазначана сетка веласшляхоў.

Велаканцэпцыя распрацоўваецца ў Магілёве і ёсць у праекце ў Брэсце, спецыяльны план мабільнасці прынялі для Полацка, дарэчы, тут збудавалі першую ў Беларусі абароненую веладарожку на тратуарах. Не такая комплексная, але таксама карысная работа праводзіцца ў многіх гарадах краіны.

Велапаркоўкамі ў сталіцы ўжо нікога не здзівіш, цяпер па горадзе з'яўляюцца спецыяльныя гаражы. Па словах Паўла Гарбунова, у новых раёнах, якія будуюць з улікам патрэб сучасных гараджан, людзі нават стаяць у чарзе, каб атрымаць права карыстацца велагаражамі за абаненцкую плату. Дарэчы, самая буйная велапаркоўка ў Беларусі знаходзіцца не ў Мінску, а каля Бярозаўскага шклянога завода, яна разлічана на некалькі сотняў веласіпедаў.

— Каб веласіпедны рух эфектыўна развіваўся, гораду неабходны адзіны адказны за гэта чалавек: веласіпедны афіцэр або саветнік мэра, як у Кіеве, дзе ён працуе на грамадскіх пачатках. У многіх гарадах гэтая пасада ўжо ўбудаваная ў адміністрацыйны апарат. Дарэчы, пост апаратара веласіпеднага руху прадугледжаны і мінскай канцэпцыяй, аднак гэтая пасада яшчэ вакантная. Такі падыход дапамога разгрузіць упраўленне спорту і турызму і больш выразна сачыць за выкананнем будаўнічых работ, суправаджаючы кожны аб'ект. Не ўсе рашэнні, якія прымаюцца цяпер, на наш погляд, аптымальныя. Напрыклад, зараз будуюць веладарожку паміж вуліцай Якубава і Лошыцкім паркам, якая каштуе мільён долараў. За палову гэтай сумы можна было б зрабіць пракат на 500 веласіпедаў (узяў у адным месцы горада — аддаў у іншым) і на працягу трох гадоў яго абслугоўваць. Гэта быў бы новы «выбух» веларуху ў Мінску. Гарадскі каардынатар растлумачыў бы перавагі такога кроку і вылічыў бы эканамічную выгаду, — разважае Павел.

### Пункты рамонту і велапарад

У многіх еўрапейскіх краінах карыстаюцца пірамідай транспартных прыярытэтаў, дзе на вяршыні знаходзяцца пешаходы, потым ідуць веласіпедысты і грамадскі транспарт, далей — машыны, якія рухаюцца, і толькі ўнізе — тыя, якія стаяць. Менавіта таму хуткасць руху па горадзе зніжаюць да 30 км/г, так нядаўна зрабілі ў Хельсінкі, а цэнтр і ўвогуле закрываюць для аўтамабіляў, вызваленае месца аддаюць пад веладарожкі. У выніку нязручным для руху падземныя пераходы адыходзяць у мінулае. Пры гэтым час прыпынку на святлафорах падладжваецца пад адзнаку 20 секунд на кіламетр шляху.

Сам веларух падмацоўваецца грунтоўна прапрацаванай заканадаўчай базай. Так, у Нідэрландах, дзе веласіпеды папулярныя не менш за аўтамабілі, стандарты якасці веладарожак распісаны на 250 старонках. Міністэрства архітэктуры Беларусі таксама нядаўна распрацавала даволі падрабязныя метадычныя рэкамендацыі, якія будуць распаўсюджаны ў найбліжэйшы час. Гатовы і чарнавік дапаўненняў у Правілы дарожнага руху, якія рэгулююць гэтую сферу.

Шмат абавязкаў бяруць на сябе велаактывісты. У сталіцы, напрыклад, яны арганізавалі бясплатны пункт рамонту «Маячок», рыхтуюць мерапрыемствы, звязаныя з бяспекай руху, выкарыстаннем начнога святла, разам з камітэтам прыродных рэсурсаў Мінгарвыканкама і ДАІ праводзяць Дзень без аўтамабіля. Брэсцкая велаарганізацыя займаецца тлумачальнай работай з людзьмі, якія ходзяць па веладарожках. У Гомелі правялі велапарад, які сабраў паўтары тысячы ўдзельнікаў. Салігорскім актывістам удалося дамовіцца з мясцовым тэхнікумам, дзе бясплатна зварылі 11 велапарковак, пасля чаго іх расставілі па ўсім горадзе. Па ўсёй Беларусі пры падтрымцы ЕС цяпер запушчаны буйны праект па прасоўванні веларуху, разлічаны на 30 месяцаў.

— Тое, што ровары цяпер у трэндзе, відаць нават па тым, калькі розных відаў іх з'явілася. Ёсць, напрыклад, драўляныя або з эксклюзіўным дызайнам. У найбліжэйшай будучыні з'явіцца больш хуткасных электравеласіпедаў, грузавых і нават трохколавых мадэляў для дарослых, — падвёў вынік Павел Гарбуноў.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

• ТЫМ ЧАСАМ

### ЕХАЛІ МЯДЗВЕДЗІ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

**Каго толькі не было сярод аматараў веласіпеднага спорту на адкрыцці веласезона. Упершыню ў Магілёве да гэтай падзеі прымеркавалі карнавал. І народ актыўна адгукнуўся, нават цэлымі сем'ямі, прыхапіўшы з сабой дзяцей дзетсадаўскага ўзросту. Шмат хто прымераў на сябе касцюмы казачных герояў.**

Эфектна глядзеліся бацька з сынам, апранутыя мядзведзем і медзведзянём. Самых вынаходлівых і арыгінальных адзначылі перад пачаткам велазабегу. Каля 10 удзельнікаў атрымалі запрашэнні ў басейн і фітнес-клуб. Але асноўныя мерапрыемствы з гэтай нагоды прайшлі ў вёсцы Канстанцінаўка, за 15 кіламетраў ад Магілёва. Веласіпедны караван, які стартаваў у горадзе ад нулявога кіламетра, суправаджалі супрацоўнікі ДАІ. На месцы ахвотныя мелі магчымасць паўдзельнічаць у розных веламерапрыемствах і прадэманстраваць свае майстэрства валодання двухколавым відам транспарту.

— Веласпорт робіцца ўсё больш папулярным у нашай краіне, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі, спорту і турызму Магілёўскага гарвыканкама Дзмітрый ЛАЦЯНКОЎ.** — Калі летась нас падтрымала каля 350 гараджан, то сёлета ўжо каля 800. Існуе некалькі аматарскіх велаклубаў, будуюцца веладарожкі.

У Магілёве павітаць удзельнікаў велапрабегу прыйшлі мэр горада Уладзімір Цумараў і яго намеснік Ала Галушка. Некаторыя супрацоўнікі гарвыканкама наогул селі на веласіпеды і далучыліся да велапрабегу. Шырока адзначылі пачатак веласезона і ў іншых гарадах вобласці. У Бабруйску, напрыклад, да акцыі далучылася больш за 200 велааматараў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# Людзі без хвароб

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з тым Міністэрства аховы здароўя ідзе па шляху пашырэння інфармаванасці насельніцтва з дапамогай сучасных тэхналогій, бо ёсць занепакоенасць распаўсюджанасцю неінфекцыйных захворванняў, у першую чаргу, сардэчна-сасудзістай і анкалагічнай паталогіі — асноўных прычын смяротнасці насельніцтва. А звязана гэта з тым, што па-ранейшаму сярод насельніцтва распаўсюджаны такія фактары рызыкі, як курэнне, нерацыянальнае харчаванне, недастатковая фізічная актыўнасць і спажыванне алкаголю. Кожны другі беларус пакутуе ад праблем са здароўем, звязаных з лішняй вагой, а каля 30 працэнтаў курыць.

Дарэчы, наступленне на тытунь працягваецца. Вось ужо і спажыванне тытуню з дапамогай парагенератараў прыраўнаванае да звычайнага курэння тытуню. Без абмежаванняў і забарон не абысціся, як не абышлася ніводная краіна, якой удалося істотна знізіць колькасць курцоў. Японія, напрыклад, мела некалі амаль 80 працэнтаў насельніцтва, залежнага ад гэтай звычкі. Аднак дзяржава паставіла перад сабой задачу знізіць паказчык, што і было дасягнута — сёння размова ідзе пра 20, а ў перспектыве плануецца дасягнуць 12 працэнтаў. З іншага боку, не забаронай адзінай... Тут і маштабная прапаганда адпаведных паводзін патрабуецца, што мы таксама не выпускаем з-пад увагі.

Партал «Здаровыя людзі» плануе рэгулярна напаўняцца інфармацыяй ад высокапрафесійных спецыялістаў, што будзе карысным як для здаровых, так і для хворых. На жаль, медыкам на прыёмах не заўсёды хапае часу, каб растлумачыць асаблівасці захворвання, правесці прафілактычныя размовы. А тут дзейнічае нават форум, на якім можна выказаць сваю думку па той ці іншай праблеме, пакінуць пытанне і атрымаць кампетэнтны адказ. Калі спатрэбіцца журналісцкае расследаванне, будзе праведзена і яно.

— Калі мы кажам пра здароўе чалавека, то сама па сабе фізічная актыўнасць, правільнае харчаванне, рэжым працы і адпачынку яшчэ не вызначаюць нашай задаволенасці, не гарантуюць пазітыўны настрой. Гэта магчыма пры іншых умовах — запатрабаванасці чалавека ў прафесіі, атрыманні адукацыі, наяўнасці кола сяброў, пры добрых стасунках з партнёрам па шлюбе, дзецьмі і бацькамі... Словам, нельга недаацэньваць псіхалагічную і эмацыянальную атмасферу, — адзначае **кіраўнік праекта «Здаровыя людзі», кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры анестэзіялогіі і рэаніматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Вольга СВЯТЛІЦКАЯ.** — Калі штосьці з гэтага выпадае, то верагоднасць таго, што чалавек трапіць да ўрача з псіхасаматычным захворваннем, вельмі высокая.

Свет моцна змяніўся, колькасць фактараў, якія не спрыяюць нашаму здароўю, няўхільна расце. Наяўнасць аўтамабіля, магчымасць рабіць пакупкі ў інтэрнэце зніжае нашу фізічную актыўнасць, а таксама вядзе да адасобленасці і адзіноты. Сёння адны людзі проста не выходзяць з дому, іншыя аказваюцца непатрэбнымі на рынку працы. На нашых вачах знікаюць і нараджаюцца прафесіі, а мы не заўсёды паспяваем да гэтага прыстасавацца. Стрэс і страх становяцца нашымі спадарожнікамі, і трэба вучыць людзей супрацьстаяць гэтаму, інакшай рана ці позна яны трапяць на бальнічны ложак.

Жыццёвы сцэнарый «садок-школа-інстытут-сям'я-работа-пенсія-дача і кропка» таксама паламаўся. Тэхналогіі аховы здароўя дазваляюць 45-гадовым жанчынам нараджаць здаровых дзяцей. Ці пажадае такая жанчына быць пенсіянеркай, калі яе дзіцяці ўсяго 10 гадоў? Усё большая колькасць людзей не жадае адчуваць сябе па жылымі ў 65 гадоў...

Цікава, што тэлеперадачы аб ахове здароўя не карыстаюцца ўжо былой папулярнасцю. Паводле сацыялагічных даследаванняў, толькі 50 працэнтаў людзей ва ўзросце да 30 гадоў уключаюць тэлевізар, і верагоднасць таго, што чалавек знойдзе неабходную перадачу аб важнай для яго праблеме, набліжаецца да нуля. Будучае, як ні круці, за спецыялізаванымі інтэрнэт-каналамі, куды і накіравала позірк Міністэрства аховы здароўя. Лягчэй сарыентавацца на сайце дапамогуць сем раздзелаў: «Будзь шчаслівым», «Харчуйся правільна», «Жыві актыўна», «Расці дзяцей», «Заставайся маладым», «Кантралюй здароўе», «Будзь незалежным». Ёсць і асабісты кабінет, можна рабіць асабістыя закладкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

**Падрабязнасці**

**Поўнамаштабнае даследаванне, якое ахапіла звыш 5 тысяч чалавек, паказала, што кураць 29,6 працэнта беларусаў, пры гэтым 27 працэнтаў — штодня. Сярэдні ўзрост пачатку — каля 17 гадоў у юнакоў і каля 20 — у дзяўчат. Радуе, што 12 працэнтаў людзей не ўжываюць алкаголь, хоць узровень спажывання спіртных напояў застаецца высокім (каля 9 л абсалютнага алкаголю ў год на душу насельніцтва). З другога боку, больш за 30 працэнтаў людзей дасольваюць ежу, заўсёды або часта ўжываюць апрацаваныя прадукты з высокай колькасцю солі — 35 працэнтаў, што, на думку спецыялістаў, вельмі шмат. Недастатковая фізічная актыўнасць — у 13 працэнтаў, а ў больш як 53 працэнтаў павышаны артэрыяльны ціск.**

## Знаток Сяргей ДУБЯЛЕВІЧ:

# «МАЛУЮ ХРУСТАЛЬНУЮ САВУ Я ЗАВЁЗ БАЦЬКАМ У ШЧУЧЫН»

**На календары яшчэ вясна, але ў тэлеклубе «Што? Дзе? Калі? у Беларусі» сёння пачынаецца лета. Ужо ўвечары ў эфіры тэлеканала АНТ можна будзе паглядзець першую гульню летняй серыі. За сталом — каманда Дзмітрыя Шпака.**
**Мы ж прапануем бліжэй пазнаёміцца з уладальнікам Малой Хрустальнай савы па выніках вясновай серыі, знатаком, які гуляе ў тэлеклубе ўжо 5 гадоў, Сяргеем ДУБЯЛЕВІЧАМ. Гутарым пра ўражанні ад такіх значных вынікаў, рытуалы і забабоны, што ёсць у гульні, камандны дух і вядомасць, якую прыносіць тэлебачанне. Таксама даведаемся, за каго з калег па клубе Сяргей «хварэе» ў летняй серыі.**



***— Сяргей, у вясновай серы на дзвюх гульнях вашай каманды ты быў проста зоркай. Як адчуваеш сябе ад такіх поспехаў і выдатных вынікаў?***

— Магчыма, гэта не было відаць звонку, але фінал вясновай серы быў адной з самых спакойных гульняў. Звычайна крыху перашкаджаюць хваляванне, часам занадта лішні азарт. І тое, што атрымлівалася знаходзіць адказы не на першых секундах, а пад канец хвіліны абмеркавання, — паказчык, што галава была больш-менш «халоднай». Вядома, з тэхнічнага пункту гледжання ўсё роўна, ты знайшоў адказ на першай ці 59-й секундзе, але і для гледача, і для ўласных уражанняў другі варыянт лепшы. Бачыцца, як падчас абмеркавання вымалёўваецца адказ, становіцца зразумелая логіка пытання. Калі ты адказаў проста таму, што ведаеш, — прыемна, але намнога прыемней, не ведаючы фактаў, разам з камандай прыдумаць правільны адказ.

***— Сам пераглядаў тыя гульні?***

— Свае гульні зазвычай не... Але фінал я вымушаны быў пераглядзець некалькі разоў разам з бацькамі — яны, вядома ж, мае фанаты — і толькі на другі ці трэці раз зразумеў дакладныя моманты, дзе нарадзіліся адказы. Бо нават саму гульню я не надта добра памятаў. Далёка не заўжды памятаю пытанні, што задаюцца за гульнявым сталом, не абавязкова прыгадаю тыя, што былі некалькі гадоў таму. Вельмі прыемна, што ў фінале я адказаў на вырашальнае пытанне па сваім філалагічным профілі.

***— У адной з гульняў серыі ты змог адказаць на два пытанні, застаўшыся адзін за гульнявым сталом. Гэта першы такі выпадак у беларускім клубе «Што? Дзе? Калі?»...***

— Па шчырасці, я нават і не памятаю, пра што было першае з тых пытанняў. Прыгадваю толькі, што яно аказалася нескладанае. А другое памятаю выдатна — яно было пра зоры і час. Адказ я знайшоў секундзе на 15-й і больш не думаў. Але вонкава паказаў, што ўсё яшчэ вагаюся. Часта бывае, што гулец падчас супербліца вельмі хутка знаходзіць адказ, але для знешняга эфекту імітуе роздум. Што зробіш, гэтага патрабуе тэлебачанне.

***— Наколькі разуменне таго, што цябе здымаюць, што гульню паказваюць па тэлебачанні, уплывае і на працэс роздуму, на тваё адчуванні за сталом?***

— Так, важна быць сабраным, засяроджаным. Але мне і дасюль часам няёмка глядзець на сябе па тэлебачанні. Ты будзеш добра гуляць, калі будзеш паводзіць сябе перад камерай натуральна, а лепш — забудзешся пра камеру. Да гэтага можна прывыкнуць, але ніхто не раіць прывыкаць. Усё ж павінен прысутнічаць жывы азарт, настрой. Калі ты гэта губляеш, адчуваеш, што гульня не прыносіць задавальнення, то навошта гуляць, хадзіць на «Што? Дзе? Калі?» як на працу? Я гэтага ніколі не зразумею.

> **«Ты будзеш добра гуляць, калі будзеш паводзіць сябе перад камерай натуральна, і галоўнае — забудзешся пра камеру».**

***— Маеш нейкія ўласныя правілы, рытуалы, якія выконваеш перад гульнёй? Магчыма, высыпаешся, п'еш многа кавы?***

— Высыпацца, зразумела, не шкодзіць, але не заўсёды атрымліваецца. Рытуалы, безумоўна, ёсць, але яны складваюцца толькі на працягу серыі гульняў. Калі перад адными здымкамі п'ю каву, то гэта стараюся рабіць і перад другімі. Калі чытаю кнігу, то на працягу серыі чытаю адну і тую ж. Гэта хутчэй мае асабістыя маленькія забабоны, а агульнакамандных рытуалаў няма.

***— Алесь Мухін у інтэрв'ю «Звяздзе» не так даўно казаў, што для знатака вельмі важна знайсці сваю каманду, дзе яму будзе камфортна гуляць. Для цябе гэта істотна?***

— Слушная заўвага. Але лічу, што мне пашанцавала. З нашай камандай пад кіраўніцтвам Андрэя Супрановіча гуляць кожны раз усё прыемней. Мы не «аб'ядаем» адно аднаго, дапамагаем. Мы даўно знаёмыя і сябруем. Так, вельмі важна знайсці сваю каманду. Адна з маіх іпастасяў — трэнер па інтэлектуальных гульнях, таму на ўласным вопыце ведаю: часта бывае, калі чалавек, актыўны і карысны ў адной камандзе, цалкам замаўкае ў іншай, бо яму некамфортна. Гэта нават не звязана з узаемнымі адносінамі гульцоў. Ты можаш сябраваць з людзьмі, але гэта не гарантыя таго, што здолееш з імі гуляць. І наадварот, людзі могуць атрымліваць асалоду ад гульні, але за межамі гульнявога стала нават не размаўляць. Я гэтага, шчыра кажучы, не разумею, мне чужы падыход да «Што? Дзе? Калі?» як да нечага толькі прафесійнага. Сур'ёзнае стаўленне — так, але з некім размаўляць толькі таму, што гэта патрэбна, — не маё. Гульня — гэта ж не сродак для заробку грошай.

***— Але ж грашовую ўзнагароду атрымліваць прыемна...***

— Так, аднак ніхто не гуляе толькі дзеля яе. У фінансавай падтрымцы праекта я нічога кепскага не бачу, больш за тое, лічу, што менавіта на тэлебачанні інтэлектуальныя гульні павінны пацвярджацца нейкімі матэрыяльнымі рэчамі, скажам так. Важна паказаць гледачу, што можна зарабіць грошы сваім розумам, што разумным быць карысна. Матэрыяльная зацікаўленасць — справа важная, але ў нашым клубе людзей, якія гуляюць толькі з-за грошай, няма.

***— Ты ўжо сказаў, што твае галоўныя фанаты — бацькі. А ёсць яшчэ прыхільнікі?***

— Калегі, вучні. На малой радзіме, у Шчучыне, мяне ведаюць, пазнаюць. Нават сваю Хрустальную саву я завёз бацькам. Мама працуе ў школе, яна паказвала саву вучням, гэта было сапраўднай падзеяй! Усе з ёй фатаграфаваліся, рабілі сэлфі. Насамрэч «Што? Дзе? Калі? у Беларусі» глядзіць не так і мала людзей. Я сам часам здзіўляюся, калі мяне пазнаюць. Бывае, незнаёмыя людзі падыходзяць павітацца. Апошні раз гэта здарылася літаральна пазаўчора. Я вазіў сваіх выхаванцаў у Гомель на чэмпіянат Еўропы па «Што? Дзе? Калі?» сярод школьнікаў. І ў чарзе па квас мяне пазнала дзяўчына, дарэчы, не ўдзельніца чэмпіянату. Прыемна.

***— Як падтрымліваеш сябе ў добрай «інтэлектуальнай форме»?***

— Гульні «Што? Дзе? Калі? у Беларусі», якія мы бачым па тэлебачанні, гэта толькі вяршыня айсберга. Рух аб'ядноўвае мноства дзяцей, юнакоў, дарослых, і на асобныя гульні збіраецца па 60—70 камандаў. Гульцы, якія праяўляць сябе на гэтым узроўні, могуць быць запрошаныя на адборы для тэлеклуба. Людзей, якія ў нетэлевізійнае «Што? Дзе? Калі?» не гуляюць, у беларускім клубе ніколі не было. Патрэбны вопыт. Самаўдасканаленне таксама важнае. Чытаю 50-60 кніг на год. Вядома, хацелася б больш. Але з-за таго, што працую ў школе, многа перачытваю і па школьнай праграме, і па-за яе межамі.

***— Ты выкладаеш рускую мову і літаратуру ў адной са сталічных школ. Вучні сочаць за поспехамі настаўніка ў гульні?***

— Так. Але я б не сказаў, што гэта мне неяк дапамагае ці перашкаджае працаваць з вучнямі. Умею сябе з імі паводзіць без дадатковых «стымулаў».

***— Сам сочыш за гульнямі калег?***

— Падчас гульняў, калі мы ўсе прысутнічаем у зале, канешне. Але па тэлевізары ці ў інтэрнэце гляджу выпускі вельмі рэдка. Ёсць гульцы, якія з'яўляюцца большымі фанатамі, праглядаюць шмат гульняў. Я ж наогул не вельмі люблю глядзець відэа, лепш успрымаю тэкставую інфармацыю. Магчыма, неяк выйду ў адпачынак і перагляджу ўсё *(смяецца)*. Але ў любым выпадку сачыць за гульнямі калег, нават свае пераглядаць і шукаць уласныя памылкі карысна для самаўдасканалення.

***— Бывае, што падчас гульні ты адказваеш правільна, а каманда за сталом дае няправільны адказ?***

— Так, але гэта не выклікае асабістых крыўдаў, абурэння. Усе ведаюць, што камандай кіруе капітан, што ён выбірае версіі. Часам удала, часам — не. Каманды не павінны сварыцца праз гэта паміж сабой. Гэта памылкі пачаткоўцаў. Я заўсёды вучу сваіх выхаванцаў: словы «Я ж казаў» павінны быць пад забаронай на трэніроўках і ў гульні. «Што? Дзе? Калі?» — гульня камандная, і тое, што ты даў правільны адказ, не важна, калі ў цэлым вы адказалі няправільна. Нельга сябе ставіць вышэй за іншых, бо гульні не атрымаецца.

> **«Менавіта на тэлебачанні інтэлектуальныя гульні павінны пацвярджацца нейкімі матэрыяльнымі рэчамі, скажам так. Важна паказаць гледачу, што можна зарабіць грошы сваім розумам, што разумным быць карысна».**

***— Для гульняў выбіраюцца пытанні, на якія можна даць адказ, кіруючыся логікай, нават не ведаючы дакладных фактаў. А як жа эрудыцыя?***

— Адно другому не перашкаджае. Так, выбіраюцца пытанні, на якія можна даць лагічны адказ, але гэта не выключае ведання самога факта. Трэба думаць. Ва ўсіх гульнях ёсць і лёгкія, і складаныя пытанні. І самая ідэальная гульня — тая, што скончылася з лікам 6:5, няважна, на чыю карысць.

***— Ваша каманда не гуляе ў летняй серыі. Вы адразу сталі ўдзельнікамі зімовай, выйграўшы ў фінале ўвесну. За каго з калег «хварэеш» цяпер?***

— Я не «хварэю» ні за, ні супраць кагосьці. Заўжды падтрымліваю каманду, якая гуляе ў дадзены момант за сталом. Узаемаадносіны ў клубе могуць быць розныя, але ў асноўным мы добразычліва стаўімся да калег. Няма такога, каб нейкай камандзе жадалі пройгрышу.




**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Можаце стаць генератарам новых ідэй і праектаў, але не варта выхваляцца сваімі поспехамі: гэтым вы можаце выклікаць зайздрасць і непрыманне навакольных. Плануючы штосьці на гэтым тыдні, лепш за ўсё трымаць у сакрэце свае задумы. Ёсць шанц усталяваць вельмі карысныя дзелавыя сувязі, што спрыяльна адаб'ецца на вашым сацыяльным статусе. Добры час для вырашэння сямейных праблем і наладжвання нефармальных узаемаадносін з калегамі.



**СКАРПІЁН.** Можна ўпэўнена прыступаць да выканання новага асабліва важнага задання. Нават і не сумнявайцеся ў поспеху. Тыдзень можа прынесці шмат цікавых магчымасцяў для атрымання прыбытку. Панядзелак і серада — добры час для пачатку новых праектаў, праявіце ініцыятыву і творчае мысленне. Могуць ажывіцца вашы адносіны з ранейшымі дзелавымі партнёрамі або цяперашнімі калегамі, яны прапануюць вам істотную дапамогу ці дадуць важнае даручэнне, з якім вы з бляскам справіцеся.



**СТРАЛЕЦ.** Не пачынайце дзейнічаць, не вызначыўшыся з мэтамі, інакш час і сілы будуць выдаткаваныя марна. Не вельмі давярайце фактам і лічбам, калі інтуіцыя кажа, што тут нешта не так, ад вас нешта хаваюць. У чацвер лепш не прадпрымаць нічога сур'ёзнага. Нядзеля, хутчэй за ўсё, астанецца ціхім і спакойным днём, прысвяціце яго сузіранню і абдумванню грандыёзных падзей, якія маюць адбыцца.



**КАЗЯРОГ.** Для пераадолення перашкод, якія ўзнікаюць на вашым шляху, трэба ўжыць максімальна асцярожную тактыку. Кожнае дзеянне павінна быць старанна выверана. Аўторак — выдатны дзень для новых пачынанняў, паспрабуйце не прапусціць момант, ганіце прэч недаверлівасць і ляноту. Субота — удалы дзень для ажыццяўлення ідэй, пачніце рамонт у кватэры, пасадзіце кветкі на дачы. Толькі спачатку выдаткуйце некаторы час на тлумачэнне вашых задум тым, хто жыве разам з вамі. Магчыма, з праціўнікаў перамен яны стануць вашымі памочнікамі.



**ВАДАЛЕЙ.** Будзеце ў добрым настроі, дзякуючы чаму ўсё намечанае атрымаецца. Калі прыкладзяце пэўныя намаганні, то перашкод у дасягненні мэт не ўзнікне. Пачынайце паступова вучыцца таму, чаго не хапае. Ваша здольнасць знаходзіць дакладныя рашэнні і своечасовая падтрымка блізкіх людзей дапамогуць стварыць выдатныя перадумовы для будучага поспеху. У чацвер варта падрыхтавацца сябе да сюрпрызаў, фартуна можа звярнуць на вас увагу. У другой палове тыдня лепш знізіць актыўнасць і нагрузку — падумаць пра адпачынак.



**РЫБЫ.** Падзеі пройдуць сапраўднай лавінай, мала што пакідаючы пасля сябе ў ранейшым выглядзе. Будзьце гатовыя да аднаўленчых работ альбо да добраўпарадкавання змененага ландшафту. Вас чакае маса навін, дзелавых сустрэч, напружаных сітуацый на працы, так што варта прадумаць свой расклад і сур'ёзна падысці да перамен, якія адбываюцца. Памятайце, што вы зможаце атрымаць з сітуацыі пэўную выгаду, калі захаваеце спакой і выявіце цярпенне.

## Чацвер, 25 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**8.40** Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Узнясення Гасподняга.
**8.50** Слова мітрапаліта Паўла на свята Узнясення Гасподняга.
**9.10, 21.45 Серыял «След».*****
**10.00, 12.00, 15.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Гаспадыня».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Дэтэктыў «Маёр і Магія».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Нашы.
**15.45, 16.05** Рэаліці-шоу «Выратуйце нашу сям'ю».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.45** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.20** Дзень спорту.
**0.30 Серыял «Апошняя сустрэча».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.45** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.00, 17.30** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
**11.35, 17.00 Серыял «Кухня».*****
**12.10, 19.55** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**14.05, 21.40, 22.05** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20, 23.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.50 Трылер «Тут нехта ёсць. Выкупленне».*****
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Вушкі з грыбамі.
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25, 17.50 «Ціхі Дон». Кінараман.***
**10.20, 12.20** «Размовы пра духоўнае».
**10.30, 12.55 «Іх ведалі толькі ў твар». Драма.***
**12.30** «Наперад у мінулае».
**14.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» Маладзечна.
**15.00 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Хмарная восень». 1-я серыя.*****
**15.50, 21.05** «Партызанскі фронт». Дак. фільм.*
**16.25, 21.40 «Маладая гвардыя». Драма. 1-я серыя.***
**19.50** «Тэатр у дэталях». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі «Анюта».
**20.40** «Калыханка».
**23.10 «1790 год». Дэтэктыў.*****

### Беларусь 5

**8.00** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Аргенціна — Беларусь (1).
**9.45, 20.25** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Фінал.
**11.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Шахцёр» (Салігорск).
**13.30** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Беларусь (2) — Лондан.
**15.20** Слэм-данк.
**15.50** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Беларусь (2) — Аргенціна. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**17.50** Авертайм.
**18.20** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Вялікабрытанія — Беларусь (1). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.15** Спорт-цэнтр.
**22.20** Хакей. Чэмпіянат свету.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік.
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Уласік. Цень Сталіна».*****
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Давай пажэнімся!»
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 17.35** «Званая вячэра».
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**11.40, 0.15 «Каманда Чэ». Серыял.**
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35** «Вадзіць па-руску».
**15.55** «Мінск і мінчане».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.00** Добрай раніцы, свет!***
**8.35** «Няма праблем!»***
**10.00** «Яшчэ танней».*
**10.30** «Любімыя акцёры». Георгій Віцын.*
**11.00, 13.15 Серыял «А золкі тут ціхія».***
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.15 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.15 Маст. фільм «Гідраўліка».*****
**0.15 Маст. фільм «Маша і мора».*****



**2.05 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.00** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Маст. фільм «Крымінальная справа».***
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Капітанша».**
**0.05** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Дачны адказ».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45, 23.05** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**19.40 Серыял «Зніклы без вестак. Другое дыханне».*****
**21.30 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».*****
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**8.00 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».**
**9.00, 17.30 Серыял «Грандгатэль».**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка».
**10.30** Рэаліці-шоу «Вяселле па разліку».
**11.00 Фантастыка «Людзі ў чорным».**
**12.40, 19.20 Серыял «Імперыя».**
**14.15 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонс».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад»: Том і Джэры.
**16.15** «Мой любімы гадавванец».
**16.40 Серыял «Я кахаю».**
**19.00** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Баявік «Залатое вока».**
**23.25 Серыял «Футбалісты».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».***
**6.30, 4.35** «Ералаш».0
**7.30, 3.25** М/ф «Фіксікі».0
**7.50, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**8.20, 4.15** М/ф «Машыны страшылкі».0
**8.30, 15.10, 19.00** Серыял «Атэль Элеон».***
**9.30** Камедыя «Бесталковыя».*
**11.25** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.00, 2.10** «Лаві момант».***
**12.30, 5.10** Серыял «Я лячу».***
**13.30** «Дом мары».***
**14.00, 20.10** Серыял «Дах свету».***
**16.20, 0.50** Серыял «Васьмідзясятыя-5».***
**16.50** Серыял «Закрытая школа-3».***
**17.50** «Уральскія пельмені».***
**21.20** Баявік «Салдат Джэйн».***
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.****
**1.20** «Дурні і дарогі».***
**1.50** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**2.40** «Не можа быць!»***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Каломба». Серыял.
**12.35** Сусветныя скарбы.
**12.55** «Яндэкс, Гугл і «алгарытм Залізняка». Дак. фільм.
**13.35** «Расія, любоў мая!» «Традыцыі і культура хантаў».
**14.05** «Ці варта нам баяцца мабільных тэлефонаў?» Дак. фільм.
**15.10** «Міхайла Ламаносаў». Маст. фільм. «Вароты вучонасці». 3-я серыя.
**16.35** «Абсалютны слых».
**17.15** «Больш чым каханне». Вальтэр і Таццяна Запашныя.
**17.55** Зоркі фартэпіяннага мастацтва. Элісо Вірсаладзэ.
**18.45, 0.30** Да 80-годдзя Андрэя Бітава. «Крок у бок ад агульнага патоку».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** «Больш чым каханне». Яніна Жэймо і Лявон Жанно.
**22.00** «Энігма». Алена Башкірава.
**22.45** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**23.30** Мастсавет.
**23.35** Навука без межаў. «Як відэагульні ўплываюць на наша жыццё?» Дак. фільм.
**0.55** Мікалай Луганскі ў Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.
**1.55** «Казус Кукоцкага». Серыял.***
**2.45** «Лаа-цзы». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Мара па-савецку». 2007 год.*
**6.50** Маст. фільм «Маленькая Вера».****
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**9.40, 11.00, 14.45, 15.40, 17.00, 19.10, 21.40, 23.00, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Нараджаныя ў СССР».*
**11.15** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым «Легалізацыя публічных дамоў». 1992 год.****
**12.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай: «Песні нашага стагоддзя». 2005 год.*
**13.10** Маст. фільм «Печкі-лавачкі».***
**17.20** Праграма «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт Канстанціна Нікольскага. 1992 год.*
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. Віктар Цой». «Дзеці хвілін». 2-я частка: «Радавацца трэба!» 2008 год.***
**19.25** Маст. фільм «Школьны вальс».***
**23.30** «Голас народа». Маналогі ў «будцы галоснасці». 1991 год.*
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дип Пёрпл». 2005 год.***
**1.20** Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».***
**5.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Раман Карцаў.*

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 10.45, 21.20, 23.05, 1.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод маладзёжных каманд (U-20).
**5.30, 9.45, 13.00, 14.15, 22.00, 0.30, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**9.30, 21.00** Тэніс. «Рыхтуйся да «Ралан Гарос».
**14.00, 18.15** Веласпорт. «Джыра-экстра».
**18.30** Тэніс. «Ралан Гарос».
**19.00** Тэніс. Турнір АТР.

### Кінакамедыя

**0.15** Камедыя «Мытня дае дабро».***
**2.10** Меладрама «З шчаслівыя парасяці».****
**4.00** Камедыя «Давай, да пабачэння!»***
**5.35** Меладрама «Казанова» (1-я серыя).***
**7.10** Меладрама «Казанова» (2-я серыя).***
**8.45** Камедыя «Манія велічы».
**10.40** Камедыя «Усё магу».***
**12.15** Меладрама «Нянька па выкліку».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**16.00** Дэтэктыў «Піражкі з бульбай» (1-я серыя).*
**16.50** Дэтэктыў «Піражкі з бульбай» (2-я серыя).*
**18.00** Камедыя «Калачы».***
**19.30** Камедыя «Выпускны».****
**21.15** Камедыя «Настаўнік года».***
**23.15** Камедыя «Фартуна Вегаса».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.25** «Доктар І...»
**8.55, 19.05** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.25, 3.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.05** «Сляпая».
**13.05** «Варажбітка».
**14.10, 5.10** «Паралельны свет».
**15.10** «Трэндзі».
**15.40** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.10** «Шчыра».
**18.05** «Цікаўная Варвара». Серыял.
**20.50** «Спатканне з зоркай».
**22.00** «Рэвізора».
**23.05** «Алігарх ТБ».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Кожную нядзелю». Маст. фільм.***
**2.55** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10** Паляўнічыя на троляў.***
**8.20** Кранутыя прафесар.*
**10.20** Тры метры над узроўнем неба.***
**12.50** Пітэр Пэн.*
**15.10** Інтэрв'ю з вампірам.***
**17.35** Версія.***
**20.10** Ілюзіяніст.***
**22.20** Кранутыя прафесар-2: сям'я Клампаў.***
**0.25** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу.***
**2.40** Апантанасць.***
**4.30** У чаканні вечнасці.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Ёлкі кудлатыя.
**8.10** Космас як прадчуванне.***
**10.05** Шапіто-шоу: павага і супрацоўніцтва.***
**12.20** За двума зайцамі.*
**13.50** Атамны Іван.
**16.20** Мама, не бядуй-2.***
**18.25** Ведзьма.***
**20.20** Поўнае ператварэнне.***
**22.10** Выпрабаванне.***
**0.10** Іронія лёсу. Працяг.*
**2.20** Сіндром Пятрушкі.***
**4.20** У стылі jazz.***

### National Geographic

**6.00, 13.25** Гульні розуму.*
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**8.00, 14.55** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**8.45, 11.05, 15.40** Шаша праз пекла.*
**9.30** Смага.*
**10.20** Паранармальнае.***
**11.50, 16.25, 19.30, 23.20, 2.30** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.40, 18.45, 21.50, 1.40** Пачатак.*
**18.00, 21.00, 0.55, 4.00** Аўта-SOS.*
**20.15, 4.50** Навука будучыні.*
**22.35** Паранармальнае.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.***
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?***
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?***
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.***
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.***
**11.00** Бітвы робатаў.
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.***
**18.00, 2.55** Харлі і браты Дэвідсан.***
**19.00, 1.00** Залаты шлях.***
**20.00, 2.00** Легенда пра золата кракадзілаў.***
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

■ 9 фактаў пра...

# МЁРТВАЕ МОРА

**На працягу стагоддзяў Мёртвае мора адыгрывала велізарную гістарычную, культурную і рэлігійную ролю, таму сёння яно з'яўляецца не толькі папулярным напрамкам для аматараў пляжнага адпачынку і аздараўленчых працэдур.**



**1.** Мёртвае мора атрымала сваю змрочную назву за безжыццёвы пейзаж і амаль поўную адсутнасць падводнага арганічнага жыцця. Тутэйшая вада перасягае акіянскую па ўзроўні салёнасці прыкладна ў дзевяць з паловай разоў. Ні водарасці, ні рыба, ні іншыя буйныя марскія насельнікі не здольныя выжыць пры такой каласальнай канцэнтрацыі солі. Толькі на дне мора былі выяўленыя некаторыя віды бактэрый і грыбоў, якія прыстасаваліся да экстрэмальнага асяроддзя.

**2.** Узровень вады ў Мёртвым моры прыкладна на чатырыста дваццаць метраў ніжэйшы за ўзровень мора. Такім чынам, тутэйшае ўзбярэжжа з'яўляецца самым нізкім участкам сушы на планеце.

**3.** Дзякуючы выключнаму геаграфічнаму размяшчэнню пасярод пустыні і гор Мёртвае мора валодае ўнікальным мікракліматам. Каля 330 дзён на год тут стаіць яснае сонечнае надвор'е, тэмпература на працягу года — ад 15 да 38 градусаў °C. Гэта адзінае месца ў свеце, дзе нават пры працяглым знаходжанні на сонцы можна не баяцца сонечных апёкаў дзякуючы натуральнай абароне ад ультрафіялетавых прамянёў.

**4.** З-за высокай колькасці солі любы чалавек будзе трымацца на плаву без асаблівых намаганняў, таму Мёртвае мора напэўна прыйдзецца да спадобы тым, хто так і не навучыўся плаваць.

**5.** Са спрадвечных часоў людзі ведалі аб цудадзейных гаючых уласцівасцях Мёртвага мора. Арыстоцель, Клеапатра і іншыя вялікія асобы наведвалі гэтыя месцы для праходжання аздараўленчых і амаладжальных працэдур.

**6.** Сучасныя навукоўцы спрабавалі шукаць у раёне Мёртвага мора рэшткі знакамітых біблейскіх гарадоў Садома і Гаморы. Іх дакладнае месцазнаходжанне зараз невядома, аднак спецыялісты амаль не сумняваюцца, што гарады былі затопленыя Мёртвым морам. Паводле Бібліі, яны былі знішчаны Богам за шматлікія грахі іх жыхароў.

**7.** Адным з інгрэдыентаў, які старажытныя егіпцяне выкарыстоўвалі пры бальзамаванні мумій падчас пахавальнага рытуалу, быў асфальт. Егіпцяне здабывалі яго ў Мёртвым моры. У тыя часы яно называлася бітумным возерам, паколькі асфальт лічыўся важнейшым за соль.

**8.** У 1947 годзе хлопчык-пастух выпадкова адшукаў у пячоры ў ваколіцах Мёртвага мора адну з найбольш значных археалагічных знаходак XX стагоддзя, так званыя Кумранскія рукапісы, або Скруткі Мёртвага мора.

**9.** Максімальная глыбіня Мёртвага мора складае крыху больш за трыста метраў, аднак за апошнія сто гадоў на дваццаць пяць метраў узровень вады апусціўся. Экалагічныя даследаванні паказваюць, што мора можа цалкам высахнуць праз пяцьдзесят гадоў, калі адпаведныя меры не будуць прынятыя.

## Нядзеля, 28 мая

### Беларусь 1

**6.45, 22.10** Меладрама «Панаехалі тут».*
**8.30** Народная раніца.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.45 Меладрама «Вясельная сукенка». 2-я серыя.***
**11.00** «50 рэцэптаў першага».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10 Меладрама «Каханне да запатрабавання».*****
**15.15** Твой горад.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Кулінарная дыпламатыя.
**16.50 Меладрама «Сардэчна запрашаем на Канары». 1—4-я серыі.***
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.

### Беларусь 2

**7.05 Дэтэктыў «Такая работа».*****
**7.45, 22.45** «Анлайн». Скетчкам.
**8.15, 18.00, 22.10** Тэлебарометр.
**8.20** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**9.25** «Калі мы дома». Скетчкам.***
**10.30 Камедыя «Дрэнныя хлопцы-2».*****
**13.00 Меладрама «Клятва».***
**14.50** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**16.00** «Універ-шэф».
**16.35** Два рублі.
**16.55** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**18.30** Міжнародная ліга КВЗ. 1/8 фіналу.
**20.15 Баявік «Тры іксы-2: новы ўзровень».*****
**22.00** Спортлато 5 з 39, КЕНО.
**22.15** «Вялікая ілюзія на Кіпры».

### Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі». Касцёл Святога Мікалая (в. Свір).
**8.05, 11.20, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 11.35, 20.30, 22.35** «Гэты дзень».
**8.25** «Беларуская кухня». Языкі ў вушах.
**8.50** «Нябесныя ластаўкі». Мюзікл.*
**11.00** М/ф.0
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.10** «Нацыянальны хіт-парад».
**13.00, 21.05** «Час кіно».
**13.10 «Без вестак зніклы». Драма.***
**14.25** «Амфітрыён». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. 1-я і 2-я дзеі.
**16.35 «Штэпсель жэніць Тарапуньку». Камедыя.***
**17.55** «Славянскі базар-2014». «Тэле-асарці».
**19.35** «Героі. Асабовая справа». Анатоль Луначарскі.
**20.40** «Калыханка».
**21.10 «Рассеяны». Камедыя.***
**22.40** «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

**8.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Другі матч.
**9.30** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Другі матч.
**11.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**11.30** Веславанне на байдарках і каноэ. Этап Кубка свету. Сегед. Фіналы.
**13.35** Формула-Е. Гран-пры Парыжа.
**14.50** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Трэці матч.
**16.35** Час футбола. Спецыяльны выпуск.
**16.50** Футбол. Кубак Беларусі. Фінал. «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск). (У перапынку — Час футбола.)
**19.10** Спорт-цэнтр.
**19.20** Тэніс. Ралан Гарос.
**21.20** Змяшаныя адзінаборствы. UFC Fight Night.
**23.50** Хакей для ўсіх.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.40** «Бесталковыя нататкі».
**10.00** «Пакуль усе дома».
**10.55** «Фазэнда».
**11.30** «Краіна Саветаў. Забытыя правадыры».
**13.30** «Пераможца».
**15.00** «Тэорыя змовы».
**16.15** Навіны спорту (з субцітрамі).
**16.20** Да 75-годдзя Аляксандра Калягіна. «За дона Пэдра!»
**17.20** Канцэрт Алега Міцяева.
**18.25** «Найлепш за ўсіх!»
**20.00** Контуры.
**21.05** «Аффтар жжот».
**22.05 Драма «Герцагіня».*****
**0.00 Камедыя «Што такое каханне».*****

### СТБ

**6.40 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Ілжывая цэль».***
**8.30** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.50, 16.00** «Аўтапанарама».
**9.20, 12.00, 15.20, 20.25, 1.50** Дзень «Важны дзень».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40** «Усім па катку».
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40 Камедыя «Формула кахання».***
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**22.00** «Рандэву з Лаймай».
**0.15 Маст. фільм «Горад шчасця, штат Тэхас».***

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.10** «Такія дзіўныя».***
**6.40, 7.25, 9.20** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**6.55** «Нітка да ніткі».*
**7.50** «Культ/Турызм».***
**8.20** «Беларусь сёння».*
**8.50** «Яшчэ танней».*
**9.30** «Любімыя акцёры 2.0».*
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Халодны разлік», 1—4-я серыі.***
**13.40 Маст. фільм «Версальскі раман».*****
**16.15, 22.00 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».*****
**21.00** «Разам».
**0.25 Серыял «Сабачая работа».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Каралева Марго».***
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр».
**12.15** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.50** «Ранішняя пошта».
**13.30** «Ха». Маленькія камедыі.
**14.15** «Смяяцца дазваляецца».
**15.30** «Вялікая ўдача».
**16.30 Маст. фільм «Замак на пяску».***
**20.00** Весткі тыдня.
**21.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**22.30 Маст. фільм «Жыццё без Веры».***
**0.10** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТВ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Аднойчы...»***
**6.35, 8.20 Серыял «Рускі дубль».*****
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі дзіцяці».
**9.25** Ядзім дома.
**10.20** «Першая перадача».
**11.00** «Цуд тэхнікі».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.10** «НашСпажыўНагляд».
**14.15 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».*****
**16.20** «Следства вялі...»
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.10 Драма «Мёртвае сэрца».*****
**23.30** «Зоркі сышліся».***

### 8 канал

**9.00, 16.05, 19.10, 21.00** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры Дзядулі Марка».
**9.45** «Адшукваецца адпачынак».
**10.15** «Мой любімы гадаванец».
**10.45 Серыял «Камісар Рэкс».**
**12.20 Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».**
**14.35 Камедыя «Формула кахання».**
**16.10 Глядзім усёй сям'ёй. Камедыя «Марлі і я».**
**17.30 М/ф «Зачараваны хлопчык».**
**18.20 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**19.15 Камедыя «Джэнтльмен-рабаўнік».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Фантастыка «Аватар».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**7.00, 2.30** «Ералаш».0
**8.30, 3.00** М/ф «Фіксікі».0
**8.50, 3.20** М/ф «Смяшарыкі».0
**9.10, 3.40** М/ф «Машыны страшылкі».0
**9.30** М/ф «Егіптус».0
**10.00** Серыял «Супер Макс».***
**11.00, 1.40** «Турбаміксер».***
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны».***
**13.10** Серыял «Апошні з Магікян-5».*
**15.10** Камедыя «Сэрцаедкі».*
**17.40** Анімацыйны фільм «Баранчык Шон».0
**19.30** «Уральскія пельмені».***
**21.00** Фантастыка «Асобная думка».*
**0.00** Еўрапейскі покерны тур-нір.****
**0.50** «Кіно ў дэталях».***
**4.00** «Лаві момант».***
**5.00** «Дурні і дарогі».***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Справа №36». Маст. фільм.
**11.55** Легенды кіно. Юрый Назараў.
**12.20** «Расія, любоў мая!» Маленні Удмуртыі.
**12.50** «Хто там...»
**13.20** «Вох ужо гэтыя мілыя жывёлы!» Дак. фільм.
**14.10** «Міфы Старажытнай Грэцыі». Дак. серыял.
**14.40** «Што рабіць?»
**15.25** Канцэрт дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля Грузіі «Эрысіёні» ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**16.55** Геніі і ліхадзеі. Макс Планк.
**17.25** «Бібліятэка прыгод».
**17.40** «Тайна вострава Бэк-Кап». Маст. фільм.
**19.10** «Пешшу...» Масква шакаладная.
**19.35, 1.55** «Шукальнікі». «Сонька Залатая Ручка: злачынны геній ці міф?»*
**20.25** «Старамодная камедыя». Маст. фільм.
**22.00** «Блізкае акружэнне Тамары Сінеўскай».
**22.55** «Юда». Маст. фільм.
**0.45** Краіна птушак. «Пустэльнікі ракі Пры». Дак. фільм.
**1.25** «Казка казак». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 2009 год.***
**6.50** Фільм-спектакль «Варшаўская мелодыя». Па п'есе Л. Зорына.***
**8.45, 9.40, 11.45, 14.40, 1.10, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**9.00, 3.00** «Мінулы час».*
**10.00** «Колба часу».***
**11.00** «Кінапанарама» з Э. Разанавым: «Майстры савецкага кіно». 2-я частка. 1982 год.*
**12.50** Маст. фільм «Чужая радня».***
**14.25** Тэлеспектакль «Выступленне Агніі Барто». 1974 год.
**15.00** «Быў час». 2009 год.***
**16.00** Маст. фільм «Вежа».***
**17.30** Маст. фільм «Пары».*
**18.00** Маст. фільм «Ахоўвай мяне, мой талісман».***
**19.10** Праграма «Вясёлыя рабяты». «Моладзь і музыка». 1986 год.*
**20.30** «КВЗ-87—88». МДУ—ДДУ—НДУ. Фінал. 1-я частка.*
**21.30** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». Салют акцёрам свету! 1991 год.*
**21.50** Маст. фільм «Бумбараш».***
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. Віктар Цой». «Дзеці хвілін». 2-я частка: «Рададаваца трэба!» 2008 год.***
**1.25** Маст. фільм «Школьны вальс».***
**4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**5.30** «Голас народа». Маналогі ў «будцы галоснасці». 1991 год.*

### EuroSport 1

**4.00, 7.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод маладзёжных каманд (U-20).
**5.30, 15.15, 22.45, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**7.00, 0.45** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**11.00** Тэніс. Australian Open-2017. Мужчыны. Фінал.
**12.00, 18.30** Тэніс. Ралан Гарос.
**15.00, 18.15** Веласпорт. «Джыра-экстра».
**22.15, 2.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**23.45** Тэніс. Ралан Гарос. Супрацьстаянне дня.

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Давай, пабачэння!»***
**2.15** Камедыя «Самка».***
**3.40** Камедыя «Нявеста любой цаной».***
**5.25** Меладрама «Мілая Фрэнсіс».***
**6.55** Прыгоды «Даспехі Бога».***
**8.30** Прыгоды «Даспехі Бога-2».*
**10.25** Камедыя «Блеф».***
**12.20** Камедыя «Фартуна Вегаса».***
**14.00** Камедыя «Імя».***
**16.00** Меладрама «Нашы палюбоўнікі».****
**17.40** Меладрама «30 спатканняў».***
**19.20** Камедыя «Навагодні адрыў».***
**20.55** Камедыя «Усё магу».***
**22.30** Камедыя «Рымскія спатканні».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «Паненка і кулінар».
**10.45, 1.35** «Цікаўная Варвара». Серыял.
**14.20** «Жонка. Гісторыя кахання».
**15.40, 17.40** «Рэвізора».
**19.00** «Амерыканскі жаніх».
**20.00** «Без падману».
**20.50** «Банды Нью-Ёрка». Драма.****
**23.45** «Асцярожна, махляры!»
**0.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**4.50** «Вялікія пачуцці».

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Пітэр Пэн.*
**8.30** Вёска праклятых.***
**10.30** Жніварь.*
**12.55** Тры метры над узроўнем неба.***
**15.25, 2.10** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу.***
**20.10** Дурдом на колах.***
**22.15** Страчаны рай.****
**0.35** Станцыя «Фрутвейл».****
**4.15** Кранугы прафесар 2: сям'я Клампаў.***

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Брат. Расія.***
**8.15** З пяці да сямі.***
**10.25** Дом на абочыне.***
**12.25** У пачатку слаўных спраў. Серыя 2.*
**13.50** Манах і Д'ябал.*
**16.15** Шапіто-шоу: павага і супрацоўніцтва.***
**18.30** Космас як прадчуванне.***
**20.20** Чалавек з будучыні.***
**22.10** Брат-2.***
**0.30** Забава.***
**2.30** Поўнае ператварэнне.***
**4.20** Выпрабаванне.***

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.*
**6.45** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 11.00** Аўта-SOS.*
**11.45** Пачатак.*
**12.35, 18.00, 21.00, 1.00** Геній.***
**13.25, 15.40, 17.15** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.*
**18.50** Тайныя гісторыі.***
**19.20** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.***
**21.50, 1.55** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.***
**23.25** «Без цэнзуры».****
**0.10** Дэследчык.****
**3.30** Нямецкая армія Чэрчыля.****
**4.20** Праслухоўка арміі Гітлера.***
**5.10** Дагістарычныя монстры Гітлера.***

### Discovery

**8.00** Дарожныя каўбоі.
**11.00, 20.00, 7.10** Загадкі планеты Зямля.***
**12.00, 21.00** Праверана на сабе.
**13.00, 22.00** Амерыканскія вынаходнікі.
**14.00** Зорнае выжыванне.***
**15.00** Смяротны ўлоў.***
**16.00, 23.00** Д'ябальскі каньён.***
**17.00, 1.00** Легенда пра золата кракадзілаў.***
**18.00** Залатая ліхаманка.***
**0.00** Геній аўтадызайну.
**2.00** Паляўнічы на антыкварыят.
**4.40** Бітвы робатаў.

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*




## МАЛАНКА, МАЛАНКА... А ГУЗІКІ ЛЕПЕЙ!

Гераіняй маёй праўдзівай гісторыі будзе... барада. Тая, што насілі, носяць і будуць насіць мільёны мужчын па ўсім свеце; тая, што вывела ў пераможцы «Еўрабачання» Канчыту Вурст; тая, пра якую ўспамінаюць, расказваючы розныя старыя анекдоты...

А вось гэта, між іншым, чыстая праўда.

Мой аднакласнік хадзіў з барадой, што зусім не дзіўна, бо ён ужо тройчы дзед ды і асоба творчая: у свой час скончыў выяўленча-мастацкі факультэт Віцебскага педуніверсітэта, мастак. А яны ж, сапраўдныя, амаль заўсёды то з вусамі, то барадой.

Фёдар сваю ўмеў насіць, прычым з форсам — і меў рацыю, бо барада ў яго была — ну проста на здзіўленне — шырокая, цёмная, густая, прадмет гонару!

Але ж аднойчы сустрэліся — і Фёдара я ледзьве пазнаў: няма той прыгожай барады, падбародзе голае, што калена! Пытаю:

— Ты што з сабою зрабіў? Навошта бараду збрыў?

А Федзя толькі ўздыхае:

— Ды ведаеш — дзень халадны, пахмурны быў, а я надумаўся ў лес схадзіць... Апрануўся, праўда, цяплей: ускінуў на плечы куртку з капюшонам. І не прагадаў — недзе праз гадзіну дождж зацерушыў... Я тут жа капюшон на галаву, потым маланку на куртцы ўверх... Думаў — пад самую бараду, аказалася — разам з... ёю: «ублыталася» яна ў замок. Паспрабаваў быў вызваліць, пацягнуць бегунок уніз — боль такі, што аж вочы на лоб. І галаву падняць не магу...

Дамоў ішоў, як той бык, — працягвае Фёдар. — Нічога вакол не бачыў. А ўжо там сваю справу зрабілі нажніцы.

— Ну дык ты б акуратна выстрыг, — павучыў чалавека я.

— Ды ўжо ж стараўся, — уздыхнуў Фёдар, — і ўсё роўна жонка, як убачыла, што атрымалася, сказала, што мяне хоць у каноплі стаў — замест пудзіла. Прыйшлося збрыць.

...Пасля гэтай размовы пагладзіў я сваю ўласную бараду і вырашыў, што з маланкамі асцярожней трэба, бо дурныя ж жарты...

А яшчэ лепш — вопратку на сіць на гузіках. Раю ўсім барадатым.

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## КАРОТКІ КУРС ГІСТОРЫІ...

Вы не паверыце: царква ў вёсцы Лучын існавала з 1172 (!) года і аж да камуністычных ганенняў, аж да «набожных» немцаў, якія ў 1944-м яе ўзарвалі — знішчылі будынак. Але ж не знішчылі веру, бо яна ў людзей, як была, так і засталася.

Трэба сказаць, што найбольш яе трымаліся жанчыны (у адрозненне ад мужчын). А самая фанатычныя з іх, тыя, што помнілі службы протаіерэя Івана Стратановіча, «бязвінна ўбіеннага» ў 1920 годзе, нават суполку сваю стварылі. Каб не «служыць д'яблу», яны не хадзілі на розныя грамадскія работы, у кустах акацыі хаваліся ад выбараў, а галоўнае — таемна то ў адной, то ў другой нейчай хаце збіраліся на службы. Замыкалі дзверы тады, завешвалі вокны, каб ніхто знадворку святла не ўбачыў, каб, крый бог, не «накрыў».

Але гэта, нягледзячы на меры бяспекі, час ад часу ўсё ж здаралася: верніц, «суполькі» шумна разганялі, папярэджвалі, страшылі. Яны пасля гэтага рабілі выгляд, што ўсё зразумелі, што болей не будуць, што дужа спужаліся, а потым па-ранейшаму правілі сваё: як маглі, як разумелі, неслі ў народ праваслаўную веру, праваслаўныя звычаі. Не вянчалі, бо тады гэта не ў «трэндзе» было, а вось адпяваць — адпявалі, калі нехта памрэ... Праўда, рабілі гэта не ўсе і не для ўсіх нябожчыкаў: асобныя з верніц адмаўляліся ў лепшы свет праводзіць грэшнікаў ды камуністаў.

Да ўсіх, без разбору, хадзіла толькі Аруша (гэта значыць, цётка Арына). Яна лічыла, што перад Богам усе нябожчыкі роўныя і, калі б паклікалі, магла б адпець хоць генеральнага сакратара ЦК КПСС...

А пакуль, як належыць, з песнапеннем, з малітвамі праводзіла ў лепшы свет землякоў.

І, вядома ж, мела каго: у вёсцы ў той час тысячы паўтары насельніцтва было, віравала жыццё — нехта нараджаўся, нехта паміраў. Значыць, і ў Арушы то адпяванне, то трызны, то дзевяціны, то саракавіны, то Радаўніца на могілках...

Апроч гэтага — праца ў калгасе і, вядома ж, сям'я, свая гаспадарка і гаспадар, якому не падабалася, што жонка вечна не дома. Да таго ж муж Арушы некалі ў камсамольцах хадзіў, шмат чаго з кніжак чытаў (у тым ліку — пра опіум для народа) і нават умеў змагацца.

Вось і з жонкай паспрабаваў.

Значыць, неяк у вёсцы з'явіўся чарговы нябожчык. Арушу папрасілі адпець. Яна не адмовіла — сабралася: адпаведным чынам адзелася, хораша прычасалася, загарнула ў хусціну трэбнік, на хвіліну выскачыла на двор. Потым вярнулася ў хату, узяла малітоўнік і пайшла да нябожчыка.

Там па завядзёнцы як магла суцешыла родных, падказала, што і як ім трэба зрабіць, каб чын чын было, потым падсела да труны, урачыста — на вачах у людзей — разгарнула хусціну і, жахнуўшыся, тут жа загарнула, бо замест падручнай любімай кніжыцы з крыжам (дарэчы, з нашай жа царквы, 1828 года выдання... Яе людзі вынеслі, перш чым немцы храм узарвалі) там ляжала іншая: ярка-чырвоная з зоркай, з сярпом і молатам, з пазалочаная назвай — «Краткий курс истории КПСС».

Убачыўшы гэтую «скверну», Аруша тройчы перахрысцілася і, дзе толькі спрыту ўзяла, сказала людзям сваё: «Прабачце, я зараз ды пабегла дамоў».

— Нешта ж рана вярнулася? — хітра спытаў гаспадар. — Можа, дзед уваскрэс ад шчырай малітвы?

Жонка нічога яму не сказала (навошта?): узяла патрэбную кнігу і рушыла назад — у хату нябожчыка.

...Што важна, ні ў той дзень, ні ў наступныя (як, дарэчы, і ў папярэднія...) з мужам сваім Аруша не сварылася. Яны ў згодзе жылі, ва ўзаемнай павазе. Ён чытаў свае кнігі (накшталт «Красавіцкіх тэзісаў»), яна — свае, у малітвах адбівала паклоны, хадзіла на службы і па-ранейшаму на адпяванні...

Адзінае, пасля таго выпадку заўжды правярала, з чым ідзе — з малітоўнікам ці, крый бог, з якім «Капіталам»... Бо мяняюцца часы, разам з імі мяняюцца норавы. А чалавечыя адносіны застаюцца. Яны, згадзіцеся, вечныя, нягледзячы на розныя канфлікты, непаразуменні і нават чорныя жарты.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын,*
*Рагачоўскі раён.*

## ЮШКА З ДАБАЎКАЙ

Гэтыя хлопцы выраслі ў адной вёсцы, вучыліся ў адным класе. Пасля школы, пасля службы ў войску прыжыліся ў горадзе, абзавяліся дзецьмі, але сябраваць не кінулі: любілі выбрацца на рыбалку. І ўжо там да ранку маглі прасядзець ля вогнішча — за размовамі, за песнямі пад гітару.

Вось і той раз Мікола пазваніў Стасю ды Жэньку... Факт, што надвячоркам уся кампанія была ўжо ў зборы — на сваім любімым месцы, на Нёмане.

Як водзіцца, налавілі рыбы, наварылі юшкі, доўга сядзелі, успамінаючы сваё дзяцінства ды вёску, у якой цяпер адны дачнікі, дзяліліся навінамі з сямейнага жыцця, шкадавалі, што не ўзялі гітару, бо вечар быў цёплы, дыхалася лёгка, на ўсе грудзі, у траве стракаталі конікі, а ў лазняку пры беразе шапацеў вецер.

— Хлопцы, пара на бакавую, — скамандаваў нарэшце Мікола. — Заўтра на зорцы ідзём рыбачыць.

Ён жа першым палез у палатку, доўга варочаўся, пакуль заснуў.

Прахапіўся, калі сонечны праменьчык праз шчыліну зазірнуў у палатку, пабудзіў хлопцаў. Спехам глынулі гарбаты, дасталі вуды. Мікола палез у багажнік па апарышаў: на іх найлепей клюе.

— Давай хутчэй, — падганяў яго Стась, — што ты там калупаешся? Заснуў ці што? Зараз клёў прапусцім.

— Ды я пакет з апарышам знайсці не магу... І сам ма ўчора паклаў... Ссабойка на месцы, рыс, што бралі для юшкі, таксама, а пакета — няма, — гучна прызнаў Мікола.

— Як гэта «рыс на месцы?» — спытаў Жэня. — А з чым мы ўчора юшку зварылі?

Хлопцы аслупянелі ад здагадкі і... кінуліся ў кусты.

— Усё, парыбачылі, наеліся юшкі, — прызнаў Мікола.

З паўгода потым не сустракаліся: неяк не хацелася — не да рыбалкі было. А потым...

Дружба ёсць дружба: яе не сапсуеш — нават апарышам.

**Галіна Нічыпаровіч,**
*в. Магільна,*
*Уздзенскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***P.S.** Мусіць, варта нагадаць, што ў рубрыцы «Алё, народ на провадзе!» «Звязда» не проста друкуе вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця сваіх чытачоў. Яна ў апошнія гады праводзіць конкурс — на самыя дасціпныя, самыя цікавыя...*

***Для таго каб вызначыць іх, створана і працуе спецыяльнае рэдакцыйнае журы, якое пры падвядзенні вынікаў абавязкова ўлічвае меркаванні чытачоў.***

***Аднак гэта — вызначэнне і ўзнагароджанне пераможцаў (аўтараў найлепшых «баек») — будзе потым, бліжэй да Каляд. А пакуль — пішыце (калі ласка, паведамляючы зваротны адрас, пашпартныя даныя ды нумар тэлефона). І, вядома ж, выпісвайце сваю родную газету на роднай мове — для таго, каб помніць яе, для таго, каб разам з краінай 9 жніўня гэтага года адзначыць стагоддзе (!) з дня выхаду яе першага нумара.***

■ Неасабісты суб'ектыў



# СЛОВЫ І СПРАВЫ

## Хто павінен прымаць меры да «містычных» экстрэмістаў?

ГЭТА разгубленае, калі не сказаць роспачнае, пісьмо прыйшло ў рэдакцыю з вёскі на Віцебшчыне ад спадарыні М. (па меркаваннях, якія стануць зразумелыя далей, я не называю ні прозвішча аўтаркі, ні дакладнага месца дзеяння). Чытачка прасіла ў газеты аднаго: каб пераслалі яе допіс у кампетэнтныя органы, якія дапамогуць рашыць праблему. Каюся: ліст мы нікуды не пераслалі. Бо праблема ў ім — з вобласці маралі і ні пад крымінальнае, ні пад адміністрацыйнае заканадаўства не падпадае, гэтаксама як і пад валявое рашэнне якой бы то ні было галіны ўлады. Зрэшты, аб усім па парадку.

У спадарыні М. — канфлікт з суседкай (з кім не бывае?). Прычым канфлікт з адценнем містыкі, бо яго каталізатарам паслужылі словы... варажбіткі. «Суседка абвінаваціла мяне ў тым, што я нібыта навяла на яе псоту, і з-за гэтага яна хварэе. Яшчэ прыгадала, што пяць гадоў назад здохла ў яе карова — таксама па маёй віне. Штурхнула мяне і злосна закрычала: «Не падыходзь да мяне ніколі, забойца, чараўніца!» Аказалася, пра псоту ад мяне ёй сказала варажбітка. У мяне мільганула думка, што суседка проста з'ехала з глузду, але калі яе муж падключыўся: маўляў, «мы ўсё ведаем, а хто наклаў мне ў машыну іголак?», я зразумела, што гэта не жарт, а цяжкае абвінавачванне. Яны настолькі ўпэўненыя ў трызненні гэтай варажбіткі, што пераканаць іх у адваротным немагчыма. А я ні ў чым не вінаватая перад імі. Ніякіх адносін я не маю ні да тых іголак, ні да хваробы гаспадыні, ні да падзяжу той каровы... Думаю, не я адна пакутую ад падобных ілжэчараўніцы. Можа быць, час ужо прымаць меры, бо шарлатанства наносіць шкоду нявінным людзям, як і тэрарызм... А калі варажбітка скажа забіць мяне («ведзьму»), і тады гаспадыня хварэць перастане, і карова ўваскрэсне?! Хіба можна вярнаць грамадству ў Сярэднявечча? Мы ж жывём у ІІІ тысячагоддзі, і такімі «лекарамі» павінна займацца пракуратура...»

ПРАЧЫТАЎШЫ гэты «крык душы», можна ўсрыняць яго па-рознаму. Можна скептычна ўсміхнуцца: дзве кабеты — адна прымхлівая, другая больш, чым трэба, бярэ да галавы — пасварыліся, і што тут такога? Можна паспачуваць аўтарцы пісьма: вёска ёсць вёска, у цеснай супольнасці, дзе ўсім да ўсіх ёсць справа, ёй цяпер нялёгка і насамрэч даводзіцца апраўдвацца не толькі перад суседзямі, але і перад іншымі, бо рэпутацыя ў вачах аднавяскоўцаў несумненна пахіснулася. Можна пагадзіцца з высновамі допісу: падобнымі выпадкамі павінны займацца кампетэнтныя органы, але тут жа і адмовіцца ад гэтай ідэі, бо дзе шукаць «доказную базу»? Дый прававой нормы ў нас такой няма, каб за «чараўніцтва» ды «варажбу» да адказнасці прыцягваць, не ў Сярэднявеччы ж сапраўды жывём і не сярод афрыканскіх плямён з іх крывавымі культамі...

Але разважаць, на маю думку, тут найперш трэба аб іншым. У плоскасці агульнай культуры цывілізаваных людзей, гістарычнай памяці і павагі да спрадвечных традыцый, якія нашы пра-пра... фарміравалі на працягу не аднаго стагоддзя. На жаль, і першага, і другога, і трэцяга ў нашым грамадстве сёння назіраецца дэфіцыт.

ХОЦЬ, трэба прызнаць, цывілізаваным і рацыянальным чалавекам перастаеш адчуваць сябе вельмі хутка пасля прагляду «Бітвы экстрасэнсаў», «Чорнага і белага» ці яшчэ якой пастановачнай халеры з трасцай, якіх на шматлікіх каналах — і айчынных, і суседскіх — хапае. Я ўжо не кажу пра рэкламу ў перадачах для хатніх гаспадынь (дзеля справядлівасці варта сказаць, што тут размова пра каналы не беларускія, але ж вялікай колькасці людзей даступныя) — на экране з'яўляюцца брутальныя барадаты маг ці варажбітка з баявой расфарбоўкай на твары і з кіпцюрамі бы ў драпежнай птушкі і абяцаюць вылечыць ад любой немачы, вярнуць каханага, засцерагчы ад сурокаў. Гавораць гэта так пераканаўча, што колькі разоў паглядзіш — і ўжо знаходзіш у сябе незразумелыя балячкі і праблемы, робіш выснову, што без містычнага ўмяшальніцтва ніадоб разычлішцаў тут не абышлося, пачынаеш збіраць чамаданы, каб ехаць у Кіеў ці Маскву запісвацца да таго тэлевізійнага мага на прыём, а потым вырашаеш пашукаць свайго, дамарослага, якому шлях на тэлебачанне закрыты, але ж развешваць на слупах улёткі і даваць аб'явы ў сеціве ніхто не забараняў... Званіш, знаходзіш, ідзеш «на сеанс», выкладваеш кругленькую суму. І, вядома ж, за такія грошы верыш усяму, што тая «ведзьма ў сямі пакаленнях» табе напляла. Сказала, што ва ўсім вінаватая суседка — ату суседку, сказала сабраць пад поўняй зямлю з дванаццаці магіл — аглядваючыся, валачэшся ноччу на клады...

Ёсць яшчэ варыянт — бясплатны. Вялікая сметніца пад назвай інтэрнэт. Шчыра кажучы, нават не падазравала, колькі містычнага паскудства там беспакарана ў свабодным доступе размешчана. Пацікавілася — жахнулася. «Як навесці смяротную псоту на палюбоўніцу мужа», «Што трэба для навядзення псоты на немаўля» — валасы дыбам становяцца ад падобных падрабязных «інструкцый», якіх — сотні, калі не тысячы. Можа, мае рацыю наша чытачка, і трэба сапраўды да тых, хто займаецца падобнымі практыкамі, хто распаўсюджвае падобную інфармацыю, прымаць меры, як да экстрэмістаў?..

І вось тут час гаварыць аб гістарычнай памяці і аб павазе да спрадвечных традыцый. У народзе да сферы непадуладнага рацыянальнаму тлумачэнню (а што такая сфера ў нашым жыцці існуе, прызнаюць сёння ўсе, нават заксанелыя скептыкі) заўсёды ставіліся з вялікай асцярожнасцю. Так, былі ў вёсках знахары — іх хаты стаялі наводшыбе, да іх ішлі толькі ў самых крайніх выпадках, бо ведалі, што атрымаць, не аддаўшы (не ў матэрыяльным плане), немагчыма. Спроба кагосьці сурочыць, прывараджыць, нават праклясці лічылася вялікім грахом, была і яшчэ адна перасцярога: усё абавязкова вернецца да цябе, калі так сраграшыў. І гэта веданне, гэта няпісанае «табу» было самым дзейсным засцерагальным механізмам ад панавання цемрашаства, якое, калі прыгледзецца, сапраўды пачынае квітнець у XXI стагоддзі. (Нядаўна пачула, што на сталічных могілках усё часцей праводзяць нейкія рытуалы: бяруць зямлю з пахаванняў, прыкопваюць у іх фотаздымкі, раздрукаваныя з сацыяльных сетак). Пакуль мы не ўспомнім спрадвечную навуку дзядоў, якая засцерагала ад падобных дзеянняў, небяспечных калі не ў фізічным, дык у духоўным сэнсе дакладна, і для самога «містыка», і для іншых людзей, — ніякія забаронныя меры не дапамогуць.

У прынцыпе, гэта ўжо і плоскасці свабоды сумлення і выбару. Але, акрамя іх, даў жа нам для нечага Божачка мазгі і душу.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by* ■

УНП 101484246

**ЗАВЕРЕНО**
